№№21–22
(2749–2750)

14 лютага 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

**Да ўвагі!**
**Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!**

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*

**Якуб КОЛАС**

# Народная Воля

*Шаноўныя чытачы!*
*Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.*

## *Студзеньскі рывок*

Мінскі трактарны завод у студзені 2008 года павялічыў аб'ём экспарту ў краіны СНД (апрача Расіі) у 2,1 разу.

Усяго за месяц на экспарт пастаўлена прадукцыі на 82 млн 824,2 тыс. долараў (на 34,8% больш). За мяжу прададзена 4 тыс. 886 трактароў і машын (на 16,2% больш).Сёлета плануецца арганізацыя зборачнай вытворчасці мінскіх трактароў у Венесуэле і Бразіліі.

**Марына НОСАВА.**

## *Пад пагрозай зрыву*

Пад пагрозай зрыву апынулася дзяржаўная праграма па адраджэнні і развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі. Такую заяву зрабіў міністр эканомікі Мікалай Зайчанка.

Праграма разлічана на 2005—2010 гады. Аднак трывогу ва ўрадзе выклікаў правал, які назіраўся ў 2007 годзе, калі не былі выкананыя заданні па росце сельскагаспадарчай вытворчасці. За апошнія тры гады супольны прырост яе аб'ёмаў склаў толькі 12,2% пры плане 20,5% на гэты перыяд. З заданнем не справілася ніводная вобласць, паведамляе "Інтэрфакс".

**ПОДРОБНОСТИ**

# Анатолий Лебедько — первый политневыездной в Беларуси

*"Ваше заявление рассмотрено Отделом по гражданству и миграции Центрального РУВД г.Минска в соответствии с п.2 ст.5 Закона Республики Беларусь "О порядке выезда из Республики Беларусь" от 02.06.1999 года в редакции от 24.07.2002 г., было принято решение об ограничении временного выезда за границу, так как в отношении вас Минской городской прокуратурой возбуждено уголовное дело по ст.367 ч.2 УК Республики Беларусь".*

Мы полностью приводим ответ, который Анатолий Лебедько получил в начале 2008 года из отдела по гражданству и миграции Центрального РУВД столицы. Под документом стоит подпись начальника управления В.Синякова. В этот же день сопредседатель Объединенных демократических сил обнаружил в почтовом ящике ответ из прокуратуры.

Начальник следственного отдела столичной прокуратуры С.Иванов сообщает, что **"Генеральной прокуратурой Республики Беларусь в отношении Вас по признакам преступления, предусмотренного ч.1 ст.367 УК РБ возбуждено уголовное дело. В настоящее время производство предварительного следствия по данному уголовному делу приостановлено на основании п.5 ч.1 ст.246 УПК РБ в связи с невозможностью производства следственных действий. Основанием для принятия решения послужило невыполнение правоохранительными органами Российской Федерации возбужденного прокуратурой города Минска ходатайства об оказании правовой помощи. В настоящее время Вы являетесь подозреваемым по настоящему уголовному делу. Мера пресечения в отношении Вас прокуратурой города Минска не избиралась, обвинение Вам не предъявлялось. По вопросам, связанным с получением разрешения на выезд за пределы Республики Беларусь, Вам следует обращаться в отдел по гражданству и миграции органов внутренних дел по месту Вашего жительства".**

Лидер ОГП еще 13 ноября подал документы на получение нового паспорта с разрешительной визой на выезд за пределы Беларуси. По действующему законодательству в течение одного месяца заявитель должен получить либо документ, либо мотивированный ответ об отказе. Но МВД и прокуратура только в начале нового года сформулировали свой письменный ответ Анатолию Лебедько. А 4 февраля лидеру ОГП было отказано в праве пересечь белорусско-литовскую границу. В его паспорт был поставлен запретительный штамп.

*"Политические нитки торчат в каждой строке ответов, полученных мной из прокуратуры и отдела по гражданству и миграции,* — говорит Лебедько. — *Надо называть вещи своими именами, а не прятаться за формулировками, лишенными не только правового содержания, но и всякого смысла. МВД кивает в сторону прокуратуры, та ссылается на то, что Россия не выполняет свои обязательства об оказании правовой помощи. Изменения в закон были внесены в 2002 году,*

*уголовное дело в отношении меня было возбуждено Генеральной прокуратурой в марте 2004 года. Но вот что удивительно, раньше это не привело к ограничению моего передвижения. Более того, после этого отдел по гражданству и миграции выдал гражданину Лебедько три паспорта. Это доказывает, что решение носит исключительно политический характер. К тому же прокуратура письменно признает, что нет никаких правовых оснований ограничивать мое конституционное право на свободное передвижение. Вместе с тем в установленный законом срок я не получил новый паспорт с разрешительным штампом, а при пересечении границы в конце декабря по старому паспорту пограничники подтвердили, что мая фамилия действительно находится в черном списке. В начале февраля в моем паспорте появилось специальное клеймо политневыездного. Почетно, что в списке моя фамилия под №1. Мне не привыкать быть первопроходцем. В 2002 году КГБ вынес мне официальное предупреждение по статье, предусматривающей наказание вплоть до смертной казни. В апреле 2006-го спецслужбы организовали мое задержание по лекалам "эскадрона смерти" и незаконно удерживали в течение 10 часов, организуя при этом психологическое давление. Процедуру своего первого избиения, организованного на лестничной площадке собственной квартиры, я прошел еще в 1996 году. Но что это дало власти? Ничего!"*

**Елена НОВИКОВА.**

**СКАЗАНО!**

## *Александр Лукашенко:*

**"В руках средств массовой информации — оружие самой разрушительной силы, и они должны контролироваться государством".**

*(Из выступления перед студентами во время посещения нового здания факультета журналистики, философии и социальных отношений Белорусского государственного университета.)*

* * *

**Александр Григорьевич, в цивилизованном мире СМИ — это прежде всего созидательная сила. Потому что через средства массовой информации общество контролирует государство, чиновников. Это только в Беларуси все поставлено с ног на голову.**

**КАМЕРТОН**
*от Сергея Ваганова*

# Такая долгая короткая память

**...Нас было двое у барной стойки в ожидании кофе — я и молодой, коротко стриженный, улыбчивый парень в яркой спортивной куртке. Что-то случилось с кофейной машиной, сквозь ее пыхтение и шипение пара из телевизора доносился комментарий к последнему визиту Путина в Минск.**

**— Вот посмотрите, вернут нам ракеты! — с каким-то задорным вызовом вдруг воскликнул парень.**

**— Чему ж тут радоваться?—не удержался я. — Вы хотите, чтобы страна снова стала мишенью?**

**— А что, плакать? Надо будет — повоюем!..**

**Этот незначительный, казалось бы, эпизод долго не давал покоя. Снова и снова я спрашивал себя: почему, почему в стране, столетиями утюженной вдоль и поперек кровавыми нашествиями, так легко стало произноситься слово "война"? Не только ведь потому, что даже глава государства так искренне верит в готовность белорусов "лечь под танки"...**

**Тут что-то еще.**

**...Недавно, вспоминая трагически погибшего в автокатастрофе Михаила Пташука, на некоторых телеканалах вновь показывали "В августе 44-го". В следующий раз покажут, наверное, 23 февраля. Потом 9 мая...**

**Надо сказать, что я снова смотрел этот фильм с неослабевающим интересом. Замечательный режиссер, великолепные актеры, захватывающий, хоть и знакомый, сюжет...**

**С неослабевающим интересом и упоением я смотрел первый в своей жизни фильм о войне — "Падение Берлина". Насмотревшись, я перевязывал голову белой марлей, предварительно вымазав ее красной помадой, напяливал сверху отцовскую пилотку, затягивался широким офицерским ремнем с пустой кобурой и, набросив на худющие плечи "плащ-палатку" — суконное, прожженное утюгом, одеяло, шел, пошатываясь, к маме на кухню — вот, вернулся с войны раненый сын...**

**Однажды, таясь среди заросших лопухами и репейником дворовых сараев, я увидел рыжего Оську, мирно строгавшего какую-то деревяшку. И, схватившись за кобуру, с которой не расставался, прошипел: "Хочешь, застрелю?" Оська не хотел. И в тот же момент острый кулачок впечатался мне в нос, а потом в подбородок, снизу, отчего в ручье хлынувшей крови повис из открытого рта прокушенный язык... А ведь это я хотел, напугав маленького Оську, дать ему снизу в подбородок, чтобы, как в "Падении Берлина", сказать: "Видишь? Наши летят!"**

**Было мне тогда лет восемь, Оське на пару лет меньше. Такой вот "момент истины".**

**...Не все помнят, а те, кто девять лет назад, когда снимался фильм "В августе 44-го", были малы, а сегодня с таким же упоением смотрят этот фильм, просто не знают, что между белорусским режиссером и Владимиром Богомоловым — автором знаменитого романа, разгорелся конфликт. Дай Бог, чтобы их примирили небеса. Но тогда, в 1999-м, дело дошло до того, что Богомолов снял свою фамилию из титров. Он считал, что правды в этом фильме нет. Жестоко и неподкупно он протестовал против коммерции, которой сопровождались съемки фильма, доказывая, что, как бы ни был талантлив режиссер, коммерция убивает правду. А в сочетании с идеологическим госзаказом — еще хуже: делает похожей на правду ложь.**

**Я говорю сейчас не только о кино, даже не о кино совсем. Я задаю вопрос, задаю его себе: почему так нескончаемо коротка память? Почему, истово бия себя в грудь, из поколения в поколение клянемся "Никогда не забудем!" и забываем, еще даже не успев сойти с исторической сцены?**

**Не потому ли, что эта клятва лукава?**

**Как лукава "линия Сталина" с ее бутафорскими рукопашными и лживой героикой...**

**Как лукавы книги, фильмы, спектакли, монументальные памятники и циклопические мемориалы, которые взращивают победоносный патриотизм на заказной истории. Истории, в которой нет и никогда не будет места героям Василя Быкова, Андрея Платонова, Алеся Адамовича, Виктора Астафьева, Юрия Германа, Виктора Козько, Андрея Тарковского, того же Владимира Богомолова...**

**Девять лет назад, будучи как журналист немного причастным к конфликту писателя и режиссера, я не мог понять, почему тогда, на излете кровавого века, уже после "Сотникова" и "Иванова детства", мне снова пытаются внушить, что воевать и побеждать — это не только захватывающе интересно, но и красиво. Но более всего я не понимал, почему это делают люди, которые, казалось бы, должны были, сродни своему поколению, знать, какая это мерзость — война, какие это грязь, кровь и пот... Может, потому, объяснял я себе, что они тоже росли из "Падения Берлина"?..**

**Сегодня, кажется, я понял это вернее: мы продолжаем громогласно произносить клятву там, где нужна тихая молитва.**

**Молитва, обращенная к себе, к своей семье до первого известного колена, к стране до самого ее корня.**

**Молитва, которая оградит от заказного "патриотизма", замешанного, по нынешним временам, на адском вареве из коммерции, политики и пропагандистского вранья, после которого так хочется вернуть ракеты...**

**Или "застрелить" бедного Оську...**

**З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ**

*Ганс Ёхэн ШМІДТ, кіраўнік Офіса АБСЕ ў Мінску:*

# «Я не хачу вельмі хутка развітацца з вашай краінай...»

**На гэтым тыдні новы кіраўнік Офіса АБСЕ ў Мінску амбасадар Ганс Ёхэн Шмідт даў першую прэс-канферэнцыю, падчас якой распавёў пра асноўныя прынцыпы сваёй працы.**

"Мне вельмі прыемна выконваць функцыю кіраўніка місіі АБСЕ ў Мінску, — *з чароўнай усмешкай сказаў амбасадар Шмідт.* — Тым больш што я не першы немец, які займае гэтую пасаду. Для мяне гэта вялікі гонар. Я задаволены, што магу працаваць над умацаваннем адносін паміж АБСЕ і Беларуссю.

Мне было прыемна ў снежні пазнаёміцца з прадстаўнікамі Міністэрства замежных спраў Беларусі, сустрэцца з міністрам Сяргеем Мартынавым і яго намеснікам Валерыем Варанецкім. Падчас сустрэчы, якая адбылася ў міністэрстве, ваш міністр і ягоны намеснік настойвалі на тым, што існуе вялікая цікавасць з боку Беларусі актыўна дзейнічаць у рамках АБСЕ. Міністр таксама сказаў, што ў гэтым годзе я павінен буду адказаць на некаторыя выклікі. Ён спадзяецца, што паспяхова. Я таксама. Бо не хачу хутка развітацца з вашай краінай. Спадзяюся, што ў мяне будзе магчымасць працаваць тут, замацоўваць нашы адносіны і прадэманстраваць, што не толькі Германія, але і іншыя краіны маюць цікавасць да Беларусі.

Хачу таксама засяродзіць увагу на некаторых праблемах. Адна з іх — даволі працяглы працэс рэгістрацыі праектаў, які абцяжарвае выкананне нашых дамоўленасцяў з беларускім урадам. Мы прапануем праекты, потым ідзе працэс абмеркавання, і калі абодва бакі дамовіліся, трэба яшчэ рэгістраваць праект. Шкада, што пасля такога ўзгаднення напрыканцы года мы больш-менш паспяваем рэгістраваць іх, але на рэалізацыю ўжо проста не хапае часу.

Мяркую, вельмі важна выпрацаваць прагматычны падыход да працы. Прагматычны, як кажа адзін з маіх калег, у пазітыўным сэнсе".

*Ганс Ёхэн Шмідт мае намер уважліва назіраць за ўсім тым, што адбываецца ў Беларусі, у тым ліку за сітуацыяй са сродкамі масавай інфармацыі, палітзняволенымі, захаваннем правоў чалавека. Але пакуль з высновамі дыпламат не спяшаецца.*

"Я зусім нядаўна прыехаў у Беларусь, таму вельмі асцярожна стаўлюся да усяго, што чую, — *гаворыць ён.* — Напрыклад, ад адной афіцыйнай асобы мне было цікава даведацца, што ў Беларусі вялікая колькасць людзей карыстаецца інтэрнетам. Калі гэта сапраўды так, то вельмі добра. Бо я лічу, што інтэрнет — гэта вельмі важна, гэта добры сродак інфармацыі. Хаця ў адной з тых краін, дзе мне давялося працаваць, улады спрабавалі кантраляваць доступ да інтэрнета.

Я проста не хачу трапіць у пастку. Нехта хоча звярнуць увагу на адно, нехта — на другое. Таму лічу, што трэба правяраць любую інфармацыю — як у судзе. Трэба быць вельмі добра праінфармаваным, выслухваць усе бакі, а гэта не так лёгка. Я зацікаўлены ў тым, каб падтрымліваць і захоўваць добрыя кантакты з прадстаўнікамі ўрада. Бо калі ў мяне не будзе падтрымкі з боку выканаўчай улады, немагчыма будзе рэалізаваць праекты. І калі ва ўрада няма даверу да працы прадстаўніцтва АБСЕ, да маёй дзейнасці, гэта не пойдзе на карысць майму намеру паглыбіць нашы кантакты. Я не баюся рэакцыі ўрада. Але гэта пытанне часу — атрымаць як мага больш інфармацыі, каб лепш ацаніць сітуацыю. Я таксама гатовы актыўна сустракацца і з тымі, хто, так бы мовіць, зараз перажывае складаны момант. Бо двухбаковы падыход значна аблягчае маю задачу і падвышае рэпутацыю прадстаўніцтва..."

**Марына КОКТЫШ.**
**Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.**

**АДУСЮЛЬ**

## *Сустрэча з Мілінкевічам забаронена*

**У Віцебску забаранілі сустрэчу з лідэрам ствараемага руху "За Свабоду" Аляксандрам Мілінкевічам.**

Мясцовыя актывісты Хрыстафор Жаляпаў, Аляксей Гаўруцікаў і Алена Фаміна, якія звярнуліся ў Віцебскі гарвыканкам па дазвол на правядзенне сходу гараджан з удзелам А.Мілінкевіча, атрымалі пісьмовую адмову.

"Там напісана вельмі жорстка: забараняю правядзенне сходу і патрабую спынення яго падрыхтоўкі, — працытаваў адмову прадстаўніка гарвыканкама Хрыстафор Жаляпаў. — Я хачу падкрэсліць, што, апрача маёй адозвы, у гарвыканкам былі накіраваны 560 подпісаў жыхароў Віцебска, якія выказалі жаданне сустрэцца з Аляксандрам Мілінкевічам. І я лічу, што забарона правесці сход з яго ўдзелам — гэта праява непавагі да гэтых людзей".

## *Прызнанне ў любові*

**Як і штогод, незарэгістраваны "Малады фронт" плануе адзначыць Дзень святога Валянціна традыцыйным шэсцем па цэнтры Мінска. Беларуская моладзь хоча прызнацца ў любові да Еўропы. І спецыяльна дзеля гэтага ўдзельнікі шэсця наведаюць амбасады краін Еўрасаюза, якія акрэдытаваны ў беларускай сталіцы.**

Акцыя, прымеркаваная да Дня любові, ладзіцца ў Мінску штогод. З 1997 года, калі шэсце пачало праводзіцца ўпершыню, у ім бралі ўдзел па некалькі тысяч чалавек. Апошнія шэсці, праўда, збіраюць менш людзей, бо пасля кожнай акцыі амапаўцы арыштоўваюць яе ўдзельнікаў.

Сёлета моладзь мае намер сабрацца на Свята любові ў 17.00 на плошчы Свабоды.

## *Ультыматум пратэстантаў*

**Пастары больш як сарака беларускіх цэркваў, што ўваходзяць у Аб'яднанне абшчын хрысціянаў поўнага Евангелля, звярнуліся да Аляксандра Лукашэнкі.**

У лісце яны выказалі занепакоенасць у сувязі з узмацненнем ціску на пратэстанцкія цэрквы. Асаблівая ўвага ў лісце была нададзена супрацьстаянню сталічных улад і мінскай царквы "Новае жыццё". Пра гэта Еўрарадыё паведаміў юрыст царквы "Новае жыццё" Сяргей Луканін.

"У гэтым лісце гаворыцца, што, калі ўлады і надалей будуць аказваць ціск на біскупа нашага аб'яднання Вячаслава Ганчарэнку, то ўсе цэрквы нашага аб'яднання пакідаюць за сабой права браць удзел у акцыях грамадзянскага непадпарадкавання па ўсёй Беларусі", — паведаміў юрыст царквы "Новае жыццё" Сяргей Луканін.

## *Падпал на складзе*

**На сумесным беларуска-літоўскім прадпрыемстве "Белвініл", што выпускае шпалеры, узнік пажар.**

Гарэлі складскія памяшканні плошчай 180 квадратных метраў. Знішчана гатовая прадукцыя. Цяпер падлічваюць урон, нанесены прадпрыемству, і высвятляюць прычыны пажару. Асноўнай папярэдняй версіяй з'яўляецца падпал.

**ПРАЦЯГ ТЭМЫ**

*Зміцер ЖАЛЕЗНІЧЭНКА:*

# «Я адмовіўся прымаць прысягу»

**Гомельскі маладзёжны актывіст Зміцер Жалезнічэнка, які пасля адлічэння з ВНУ быў тэрмінова прызваны ў армію, адмовіўся прымаць вайсковую прысягу.**

Нагадаем, што студэнта-выдатніка Зміцера Жалезнічэнку два разы за апошні навучальны год адлічалі з Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. Прычым сваё першае адлічэнне хлопец абскардзіў у судзе, і быў адноўлены ў правах студэнта. Праўда, літаральна праз некалькі дзён пасля аднаўлення па загадзе рэктара Жалезнічэнку адлічылі зноў. Хлопец не паспеў абскардзіць гэтае рашэнне, бо яго забралі ў войска.

Жалезнічэнку накіравалі ў Жлобін, у чыгуначныя войскі. Рашэнне прызыўной камісіі выклікала абурэнне ў Жалезнічэнкі, і ён цягам некалькіх дзён трымаў галадоўку, пратэстуючы супраць незаконнага рашэння аб адлічэнні і прызыву на вайсковую службу.

Тым часам маці прызыўніка-бунтара Ала Фёдараўна ад імя сына звярнулася ў суд Савецкага раёна Гомеля з іскам аб прыпыненні дзеяння рашэння гомельскай гарадской прызыўной камісіі. Суддзя Юрый Жораў прыняў рашэнне прыпыніць прызыў да разбіральніцтва. Але Жалезнічэнка на гэты момант ужо быў у арміі.

Нягледзячы на рашэнне суддзі, Зміцера Жалезнічэнку разам з іншымі навабранцамі прывезлі на прысягу. Але з воклічам "Жыве Беларусь!" ён прымаць прысягу адмовіўся. Сваё рашэнне хлопец патлумачыў так: "Я адмовіўся прымаць вайсковую прысягу. Яна як бы даецца на вернасць народу, але я лічу, што па сутнасці гэта не так. Гэта прысяга на тое, што чалавек будзе рабіць менавіта тое, што яму загадаюць камандзіры, начальнікі і гэтак далей. Я свайму народу верны і гэтага не хаваю. Натуральна, калі мяне адновяць ва універсітэце і дадуць давучыцца, а пасля нармальна забяруць у войска, я вайсковую прысягу прыму. Але, канешне, не цяпер".

Адстойваючы правы свайго сына, Ала Жалезнічэнка прывезла копію рашэння суда Савецкага раёна Гомеля ў вайсковую часць, дзе знаходзіцца Зміцер. Але на камандаванне часці гэта не зрабіла ўражання. Вайскоўцы спасылаюцца на тое, што рашэнне суда распаўсюджваецца на дзеянні прызыўной камісіі, а не вайсковай часці, таму адпускаць Зміцера нікуды не збіраюцца.

На момант напісання матэрыялу ніякіх афіцыйных каментарыяў з боку Міністэрства абароны па "справе Жалезнічэнкі" не было. Пакуль хлопец застаецца ў вайсковай часці Жлобіна, дзе асвойвае прафесію кінамеханіка.

**Антон ВІТАЛЬЕЎ.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
14 ЛЮТАГА 2008 г.

СПЕЦИАЛЬНЫЙ РЕПОРТАЖ

# Кому мешает «Беларусь»?

*Более 350 сотрудников персонала минской гостиницы "Беларусь" подали в Администрацию президента письмо с просьбой разъяснить ситуацию с возможным сносом одного из лучших отелей столицы.*

Корреспондент "Народной воли" побывал в гостинице, ознакомился с настроением масс, а также попытался узнать о будущем "Беларуси".

Гостиница "Беларусь", расположенная на возвышенности неподалеку от проспекта Победителей, имеет очень завидное географическое положение. Центр города, зеленая зона на берегу Свислочи... Невысокие цены, поскольку отель трехзвездочный. Одним словом, любимое место для многих гостей столицы.

Но тихое и безобидное существование "Беларуси" было "взорвано" 22 января, когда в Минской городской ратуше во время знакомства Александра Лукашенко с генеральным планом застройки проспекта Победителей главный архитектор города Виктор НИКИТИН заявил, что на месте гостиницы "Беларусь" в Минске планируется возвести гостинично-деловой центр.

Александру Григорьевичу отрапортовали, что в настоящее время эксплуатация гостиницы "Беларусь" является малоэффективной, ее внутренние помещения не соответствуют международным требованиям, а небольшие гостиничные номера не дают возможности реконструировать здание с целью создания комфортных условий. Кроме того, нет возможностей для оборудования этого строения эффективной системой инженерного обеспечения.

Обрисовали и радужные планы. После демонтажа здания гостиницы, на ее месте запланировано построить современный архитектурный ансамбль. Главный архитектор Минска Виктор НИКИТИН рассказал об "ансамбле". Это будут пятизвездочный гостиничный комплекс и деловой центр класса "А". В состав комплекса также войдут развлекательный центр, бассейн, спортивные сооружения и другие объекты, а сам он будет состоять из трех башен, в двух из которых разместится гостиница, в третьей — деловой центр. На верхних этажах расположатся несколько ресторанов с обзорными площадками, а также предполагается, что новый отель будет оснащен вертолетной площадкой.

По словам Виктора Никитина, "желающие участвовать в этом инвестиционном проекте уже есть, мы планируем, что будущий инвестор профинансирует расходы на демонтаж гостиницы "Беларусь".

Возможно, кто-то воспринял эту информацию с воодушевлением, но только не работники "Беларуси", которые на днях отправили возмущенное письмо в Администрацию президента. А я отправляюсь в гостиницу, где меня сначала встретили настороженно:

— Из "Народной воли"? Так газета же запрещенная...

**— Кто вам такое сказал?**

— Ну... Говорят...

**— Глупости говорят. Газета — официально зарегистрированный орган печати.**

— Ну хорошо, только не пристегивайте нас к политике...

**— А при чем здесь политика, когда вас, судя по всему, в скором будущем на улицу отправят? — теперь уже недоумеваю я.**

И тут народ прорвало. Мне эмоционально рассказывают о том, как буквально весь персонал был возмущен известием о том, что гостиницу снесут. Рассказчики просят только об одном — не называть их фамилий.

— У нас сегодня рентабельность — 30 процентов, — начинает одна из собеседниц. — Четыре года назад построили свой ФОК, бассейн, тренажерный зал, разиваемся только за счет собственных средств. Из бюджета не берем ничего. Поэтому не понимаю — зачем говорить, что мы неэффективное предприятие, как это подается в прессе? Кому выгодно разрушение такого предприятия? В прошлом году вот сделали евроремонт. Из простых номеров сделали номера бизнес-класса, всего отремонтировали уже семь этажей.

**— Это правда, что коллектив отправил письмо в Администрацию президента?**

— Было такое обращение, потому что весь коллектив (а это около 450 работников) не понимает, как можно сносить такую гостиницу, а на ее месте строить пятизвездочную? Интересно, а кто-нибудь сделал анализ, насколько у нас заполняемы пятизвездочные отели? Как долго и как быстро это все будет окупаться? Поэтому люди у нас недоумевают, и 360 человек поставили свои подписи под письмом в Администрацию президента с просьбой предотвратить разрушение.

— Мы попросили четко и внятно разъяснить нам, что же на самом деле происходит? — подключается к разговору вторая сотрудница администрации гостиницы. — Почему официальные СМИ передают и пишут, что мы неэффективные и неприбыльные? Почему врут, откуда "растут ноги"? "Минский курьер", на прошлой неделе СТВ на всю страну заявили, что мы нерентабельны. Но это же ложь!

**— А когда будут сносить гостиницу, не знаете?**

— Так нам вообще никто и ничего не говорит. Все в полном неведении. Только целенаправленно долбят в СМИ о нашей нерентабельности. Страдает наш имидж — вот и все.

Далее меня ведут по уже отремонтированным номерам, которые действительно впечатляют. Санузлы — как в лучших отелях Европы, новая мебель, отличная отделка.

**— Получается, что столько денег угробили, если гостиницу снесут? — сами себе задают риторический вопрос сотрудники гостиницы.**

— Как на пороховой бочке сегодня живем, — жалуется горничная Валентина, проработавшая в гостинице "Беларусь" более десяти лет. — Куда людям деваться после того, как снесут гостиницу? Ходили слухи, что вроде трудоустроят в бывшую гостиницу "Свислочь", которая открывается, но это же всего лишь слухи. Куда людям, которые проработали здесь по двадцать лет, деваться перед пенсией? Кто нас куда возьмет? У нас обо всем этом знаете как говорят? Что кому-то очень выгоден снос гостиницы "Беларусь", и здесь замешаны очень большие деньги. Можно только догадываться — кому...

После посещения гостиницы я попытался связаться с начальником Комитета архитектуры и градостроительства Мингорисполкома Виктором Никитиным. Вопросов было очень много. Так ли нужны Минску дорогие отели, если пустуют и ныне действующие? Почему для строительства нового "ансамбля" нужно сносить гостиницу "Беларусь", а не построить гостиничный комплекс в другом месте? Неужели у нас нет земли для строительства новых гостиниц? В конце концов: когда будет снесена гостиница "Беларусь", коль уж об этом заявлено? И кто инвесторы?

Увы, но в приемной главного архитектора Минска секретарша "грудью встала" на защиту своего шефа, заявив, что "Виктор Дмитриевич настолько занят, что по этому вопросу вообще говорить ничего не будет". Очень жаль. Может быть, ответ из Администрации президента работникам "Беларуси" что-нибудь прояснит в судьбе гостиницы. Подождем...

**Алесь СИВЫЙ.**
**Фото photo.bymedia.net**

З-ЗА КРАТАЎ

## *Казулін прапануе стварыць урад народнага даверу*

**Былы кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін напісаў з калоніі ліст да паплечнікаў з апазіцыі.**

Ён даводзіць, што "беларуская апазіцыя, асабліва партыі, у цэлым аслабіла свой уплыў на сучаснае палітычнае жыццё краіны, на ход найважных падзей. На вастрыё барацьбы выйшаў рух індывідуальных прадпрымальнікаў і моладзі. Кіруючы рэжым сваімі рэпрэсіямі паказаў, што ён смяротна баіцца арганізаваных выступаў сацыяльных груп".

Але, на думку Казуліна, тым самым прадпрымальнікам "без палітычнай падтрымкі дэмакратычнай апазіцыі будзе значна цяжэй выдужаць пад ударамі машыны ўлады".

Казулін кажа, што "цяперашняе палітыка-эканамічнае становішча ў краіне настойліва патрабуе актывізацыі партыйных структур, перш за ўсё тых, што ўваходзяць у склад Аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі".

Дэмакратычнай апазіцыі, лічыць Казулін, неабходна правядзенне сваёй самастойнай, дэталёва прадуманай і спланаванай палітыкі падтрымкі патрабаванняў прадпрымальнікаў па шэрагу напрамкаў:

— інфармацыйная асвета насельніцтва аб грамадскай карысці дзейнасці прадпрымальнікаў;

— мабілізацыя міжнароднай грамадскай думкі ў іх абарону і падтрымку;

— распрацоўка і прасоўванне праграмы рэформ і адпаведных законапраектаў па стварэнні ўмоў вольнага развіцця дробнага і сярэдняга бізнесу ў краіне;

— правядзенне самастойных масавых акцый, скаардынаваных з пратэстамі прадпрымальнікаў.

*"Мяркую, што аб'яднаныя дэмакратычныя сілы павінны дзейнічаць па адзіным стратэгічным плане, са стварэннем, пры неабходнасці, адпаведных каардынацыйных цэнтраў. Лічу, што мая ініцыятыва аб стварэнні ўрада народнага даверу цяпер, як ніколі, актуальная, і звяртаюся з гэтай прапановай да Палітсавета АДС"*, — напісаў Казулін на волю.

АБІТУРЫЕНТ-2008

# Спецадбор

*Стаў вядомы пералік спецыяльнасцяў, пры паступленні на якія да абітурыентаў будуць прад'яўляцца "асаблівыя патрабаванні" і будзе праводзіцца прафесійна-псіхалагічнае сумоўе або тэсціраванне.*

Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб змяненнях у правілы прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы Беларусі. Да спецыяльнасцяў, якія трапляюць пад "асаблівыя патрабаванні", аднесены: "дзяржаўнае кіраванне", "дзяржаўнае кіраванне і права", "міжнародныя адносіны", "міжнароднае права", "правазнаўства", "журналістыка", "міжнародная журналістыка", "мытная справа" і некаторыя іншыя. Парадак прафесійна-псіхалагічнага сумоўя або тэсціравання ўстанаўлівае Міністэрства адукацыі.

Нагадаем, што, згодна з праектам указа, будучыя журналісты і кіраўнікі перад паступленнем павінны былі браць рэкамендацыі ў органах мясцовай выканаўчай улады. Аднак у канчатковы тэкст дакумента гэтае палажэнне не ўвайшло. *"Такім рашэннем мы маглі спарадзіць карупцыю ў гэтай сферы. Акрамя таго, рашэнне аб прафпрыгоднасці абітурыента ўсё-такі павінна прымацца спецыялістамі ў ВНУ"*, — патлумачыў кіраўнік камісіі па адукацыі палаты прадстаўнікоў Уладзімір Здановіч.

**Таццяна ДАРАШЧОНАК.**

## МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ!

**Указам Аляксандра Лукашэнкі ўнесены і шэраг іншых змяненняў у правілы прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы Беларусі. У прыватнасці, амаль на тыдзень скарочаны тэрміны падачы дакументаў у ВНУ, а таксама тэрміны правядзення ўступных выпрабаванняў.**

Ранейшы тэрмін падачы дакументаў захаваны толькі ў творчых ВНУ — з 5 па 11 ліпеня. У той жа час абітурыентам, якія не прайшлі па конкурсе, можна будзе падаць дакументы на завочную або вячэрнюю форму навучання па 23 ліпеня (раней — па 24-е), на платную форму — па 25 ліпеня (раней — па 26-е).

У ВНУ ваеннага і сілавога профілю тэрмін падачы дакументаў — з 5 па 13 ліпеня (раней — з 5-га па 16-е). Падаць дакументы ў гэтай жа ВНУ на завочную і вячэрнюю формы можна па 19 ліпеня (24-е), для ўдзелу ў конкурсе на дзённую, завочную і вячэрнюю формы атрымання адукацыі на ўмовах аплаты — па 21 ліпеня (26-е).

Ва ўсіх астатніх ВНУ любой формы ўласнасці прыём дакументаў будзе праходзіць з 12 па 23 ліпеня (раней 12—29 ліпеня), а на ваенных факультэтах — з 12 па 21 ліпеня (12—26 ліпеня). Абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе, могуць падаць дакументы на завочную або вячэрнюю форму атрымання адукацыі па 31 ліпеня (7 жніўня), на ўмовах аплаты — па 2 жніўня (9 жніўня).

Адпаведна скарочаны і тэрміны правядзення ўступных выпрабаванняў. У творчых ВНУ яны пройдуць з 12 па 21 ліпеня (раней — 12—22 ліпеня), у ваенных — з 14 па 17 ліпеня (18—21 ліпеня), у іншых дзяржаўных і прыватных ВНУ — з 24 па 28 ліпеня (31 ліпеня — 4 жніўня).

З правілаў паступлення выключаны экзамен унутры ВНУ па прадметах, якія ўключаны ў цэнтралізаванае тэсціраванне. Зменшана колькасць катэгорый абітурыентаў, якія маюць права на пазаконкурснае залічэнне. Такое права захавана за дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама за пераможцамі і прызёрамі міжнародных і рэспубліканскіх прадметных алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, спартыўных спаборніцтваў.

ЗДАРЭННЕ

## *Уладзімір РУМЛ:*

# «Я выказваю спадзяванне, што гэтае здарэнне не было правакацыяй»

Днямі быў здзейснены напад на будынак амбасады Чэшскай Рэспублікі ў Беларусі. Невядомыя разбілі акно, пашкодзілі аўтамабіль амбасады, а таксама замахнуліся на дзяржаўны сцяг Чэхіі.

Адразу пасля здарэння супрацоўнікі чэшскай амбасады накіравалі ліст на адрас Міністэрства замежных спраў Беларусі, у якім паведамілі пра інцыдэнт. Пра падрабязнасці інцыдэнту "Народнай волі" распавёў Часовы Паверaны ў справах Чэшскай Рэспублікі ў Беларусі Уладзімір Румл.

— Пра здарэнне я даведаўся ў той жа дзень па каналах дыпламатычнай службы, — гаворыць дыпламат. — Гэта была субота, непрацоўны дзень, таму ў амбасадзе нікога не было. Я, даведаўшыся пра здарэнне, адразу накіраваўся сюды. Прыехаўшы, убачыў, што пашкоджана акно і дыпламатычны аўтамабіль. Тут, на месцы, ужо працавалі супрацоўнікі міліцыі, якія рабілі агляд месца здарэння.

**— На што вы адразу звярнулі ўвагу, прыехаўшы да амбасады?**

— На характар пашкоджанняў акна. Я думаю, што невядомы спрабаваў скрасці чэшскі сцяг і для гэтага выкарыстаў нейкі жалезны прадмет. Гэты прадмет быў даволі цяжкім. Магу меркаваць, што гэтым жалезным прадметам злачынца спрабаваў зачапіць сцяг, але не здолеў, і гэты жалезны прадмет упаў на капот дыпламатычнай машыны, пакінуўшы на ім увагнутасць.

**— Ці ёсць якія-небудзь вынікі расследавання?**

— Адразу пасля здарэння быў складзены пратакол. Міліцыя спрабавала выкрыць злачынцу "па гарачых слядах", але, на жаль, відэакамеры на будынку нашай амбасады не запісваючыя. Я чуў, што міліцыя затрымала маладога чалавека, які падазраецца ва ўчыненні гэтага злачынства. Але дакладна пра гэта гаварыць не магу, бо трэба яшчэ ў гэтым упэўніцца. Я выказваю глыбокае спадзяванне, што гэтае здарэнне было выпадковым, а не спланаванай правакацыяй.

**— Спадар Румл, з дня здарэння прайшло ўжо больш за дзесяць дзён. Чаму яшчэ не адрамантавана пашкоджанае акно?**

— Гэта не наша прэрагатыва. Будынак, дзе знаходзіцца амбасада, мы арандуем. Таму ўсе рамонтныя работы павінна заказваць арганізацыя, якая здала нам гэтае памяшканне.

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

КАДРЫ

# В РНПЦ «Кардиология» новый руководитель

**Клинику возглавил доктор медицинских наук, член-корреспондент Академии наук, известный в стране кардиолог Александр Мрочек.**

Бывший директор Республиканского научно-практического центра "Кардиология" Игорь Адзерихо ушел не только с ответственного поста, но и из клиники, которой руководил 4 года. Сейчас он работает на кафедре терапии Белорусской медицинской академии последипломного образования.

Сам Игорь Адзерихо комментировать свой уход не хочет. "Не сейчас", — это едва ли не все, что удалось от него услышать.

11 февраля Игорь Адзерихо вместе с другими руководителями РНПЦ был вызван в Московский суд Минска. Игорь Адзерихо, а также известный в стране кардиохирург Юрий Островский и руководитель центра с 1993-го по 2004 год Николай Манак должны были давать свидетельские показания по делу заведующего 2-м кардиологическим отделением РНПЦ Александра Шкета. Его, как известно, обвиняют в получении взяток и злоупотреблении служебными полномочиями. Но слушания пришлось отложить по причине болезни одного из присяжных.

*— Не думаю, что эти разбирательства — причина моего увольнения,* — выглядел Игорь Адзерихо подавленным. — *Поработаю на кафедре БелМАПО, а там посмотрим.*

Справедливости ради стоит отметить, что слухи о возможной отставке Адзерихо с поста директора РНПЦ "Кардиология" ходили очень давно. В адрес кардиологической службы страны и лично Игоря Адзерихо не раз звучала критика из уст не только руководителей Министерства здравоохранения, но и вице-премьера страны Александра Косинца, курирующего в правительстве социальный сектор.

В Беларуси несколько лет подряд показатели смертности от сердечно-сосудистых заболеваний остаются самыми высокими и составляют более 50 процентов в структуре смертности населения. Не могли не сказаться на работе центра и громкие уголовные дела в отношении кардиохирургов центра, которые тянутся с 2004 года. В РНПЦ увеличились очереди на операции, имели место случаи отказа от сложных операций пациентам старше 70 лет. В несколько раз сократилось число операций по поводу сложных нарушений ритма сердца — катетерных аблаций. В 2003 году их было выполнено более 200, а в прошлом — всего лишь 60, и это с учетом того, что республиканский центр получил новое оборудование.

Многие сотрудники РНПЦ не скрывают надежды на то, что с приходом Александра Мрочека центр заработает с прежней мощностью, что врачи будут иметь возможность помочь большему количеству пациентов.

До назначения на должность директора РНПЦ "Кардиология" Александр Мрочек возглавлял кафедру кардиологии и ревматологии БелМАПО, руководил отделением интервенционной кардиологии Минского городского центра. В 2007 году во многом благодаря Александру Мрочеку столичный центр провел тендер на закупку оборудования для хирургии нарушений ритма сердца на сумму 1,5 миллиона долларов. В отделении проводятся те операции, которые раньше выполняли только кардиохирурги РНПЦ "Кардиология". В прошлом году, например, в столичном центре 85 пациентам были имплантированы электрокардиостимуляторы, только за один месяц удалось сделать 12 катетерных аблаций.

**Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.**

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

## *В деле кардиохирурга объявлен перерыв*

Слушания по делу заведующего 2-м кардиохирургическим центром РНПЦ "Кардиология" Александра Шкета возобновятся 20 февраля.

Несколько дней назад в канцелярию Московского суда Минска было передано обращение пациентов центра, которые выступили в защиту обвиняемого Александра Шкета. Подписи поставили более 80 человек, среди них — народные артисты Беларуси, лауреаты премии президента, кандидаты и доктора наук.

*"В 2002 и 2006 гг. А.П. Шкет по результативности работы был признан лучшим хирургом Республиканского кардиоцентра, — сказано в обращении, — и это на фоне работы уже признанных кардиохирургов — докторов наук и профессоров.*

Отдельные из операций, например, самые сложные аневризмы аорты, оперируются у нас в республике только им и главным кардиохирургом Минздрава Беларуси профессором Ю.П.Островским. О профессиональных заслугах А.П. Шкета говорят как желание больных только ему доверить свою жизнь, т.е. именно к нему попасть на операцию, так и признание его профессиональных достижений коллегами и руководством центра...

В нашем государстве сейчас много говорится о здоровье нации. Так вот, здоровье нации находится в руках именно таких врачей, как А.П.Шкет. С этой точки зрения Александр Петрович — государственный человек и имеет государственную ценность".

РЭГІЁН

## *Стыхійны пратэст*

На Баранавіцкім мясакамбінаце прайшоў стыхійны мітынг супраць закрыцця цэхаў і масавага звальнення людзей.

Днямі там згубілі працу каля 40 чалавек з кансервавага цэху. Такі ж лёс пагражае яшчэ сотні работнікаў камбіната.

Не так даўно прадпрыемства было далучана да Бярозаўскага мясакамбіната, нібыта з мэтай рэканструкцыі і мадэрнізацыі. Аднак гэта перайшло ў згортванне вытворчасці і звальненне працоўных, бальшыня з якіх — жанчыны.

СКАНДАЛ

## *Час збіраць камяні...*

Узбуджана крымінальная справа супраць намесніка генеральнага дырэктара ААТ "Мінскі гадзіннікавы завод".

Па папярэдняй інфармацыі, намеснік дырэктара падазраецца ў злоўжыванні службовым становішчам з нанясеннем прадпрыемству стратаў у асабліва буйных памерах. Фігуруе і сума стратаў — 186,9 мільёна рублёў. Маўляў, намеснік дырэктара наўмысна ўстанавіў памер ставак арэндной платы ніжэй устаноўленага прэйскурантам завода.

Зараз справай займаецца пракуратура Першамайскага раёна Мінска.

ДАРЭЧЫ

**Інцыдэнт ля будынка чэшскай амбасады адбыўся пасля сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з амбасадарам Германіі спадаром Вайсам. У ходзе той сустрэчы Лукашэнка, у прыватнасці, заявіў:**

**"Я не зусім разумею ролю амбасадараў краін Еўрасаюза, у большасці сваёй, і асабліва амерыканскага амбасадара. Я не хачу гэтага утойваць, і таму я часам рэзка выказваюся. Мы — суверэнная дзяржава на працягу паўтара дзесятка гадоў. Тое, што мы стабільны і нікому ніякіх праблем не ствараем, ні суседзям, ні Германіі, ні Францыі, ні ЗША, — гэта факт. Так чаго ад нас хочуць?**

**Атрымліваецца парадокс: у прыватным парадку яны (амбасадары — Рэд.) практычна заўжды выказваюць падтрымку таго, што адбываецца ў Беларусі. Іх задавальняе стабільнасць, якая ёсць у Беларусі. Але. Калі мы афіцыйна чуем заявы некаторых амбасадараў і бачым іх рэальныя дзеянні, то робіцца вельмі сумна".**

Народная Воля http://www.nv-online.info
14 ЛЮТАГА 2008 г.

АКЦЫЯ

## Ці будзе вольным Дзень волі?

**У Мінгарвыканкам пададзена заяўка на правядзенне 25 сакавіка ў сталіцы мітынгу і шэсця з нагоды 90-й гадавіны абвяшчэння БНР.**

Заяўку на правядзенне шэсця і мітынгу падпісалі старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, кіраўнік руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч і старшыня аргкамітэта па стварэнні БСДП (Народная Грамада) Мікалай Статкевіч.

Заяўнікі плануюць, што ўдзельнікі акцыі збяруцца ў 18.00 на плошчы Якуба Коласа перад будынкам Белдзяржфілармоніі, пройдуць па праспекце Незалежнасці да вуліцы Валадарскага, а потым — па вуліцах Гарадскі Вал, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы. Шэсце павінна завяршыцца невялікім мітынгам у скверы Янкі Купалы.

Падчас акцыі ўдзельнікі плануюць ускласці кветкі да помнікаў Якубу Коласу, Янку Купалу, Максіму Багдановічу, Адаму Міцкевічу, а таксама да дома, дзе адбылося абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.

Паводле слоў В.Івашкевіча, *"цяжка прагназаваць, якім будзе адказ улад". "Але існуе вялікая верагоднасць, што мітынг і шэсце будуць дазволены. Пра гэта сведчаць падзеі восені 2007 года, калі былі дазволены Еўрапейскі і Сацыяльны маршы, а таксама вызваленне Артура Фінькевіча",* — зазначыў ён.

Палітык лічыць, што беларускія ўлады "зацікаўлены зрабіць чарговыя крокі добрай волі".

**Сяргей КАРАЛЕВІЧ.**

ВЫБАРЫ

## Тры ўмовы чэсных выбараў

**Палітсавет аб`яднаных дэмакратычных сіл (АДС) зацвердзіў стратэгію ўдзелу прадстаўнікоў дэмсіл у парламенцкіх выбарах 2008 года. Адпаведнае рашэнне прынята на пасяджэнні Палітсавета АДС у Мінску.**

Кіраўнікі аб`яднаных дэмакратычных сіл лічаць, што выбары ў Палату прадстаўнікоў могуць быць прызнаныя ўнутры краіны і міжнароднай супольнасцю толькі ў выпадку захавання асноўных міжнародных крытэрыяў, што вызначаюць дэмакратычнасць выбараў.

Палітсавет патрабуе ад дзяржавы выканання некалькіх мінімальных умоў: тэрміновага спынення пераследу палітычных апанентаў і вызвалення палітзняволеных; уключэння прадстаўнікоў АДС у склад выбарчых камісій усіх узроўняў; рэгістрацыі назіральнікаў за выбарамі і кандыдатаў у дэпутаты ад АДС.

На думку ўдзельнікаў Палітсавета, гэтыя ўмовы павінны быць падмацаваныя наступнымі патрабаваннямі: спыненне адміністрацыйнага ціску на кандыдатаў у дэпутаты ад АДС; забеспячэнне свабоды і роўнасці ў перадвыбарнай агітацыі, адсутнасць цэнзуры ў друкаваных матэрыялах кандыдатаў ад апазіцыі і ў тэкстах іх выступленняў на радыё і тэлебачанні; забеспячэнне магчымасці назірання за працэсам падліку галасоў членамі ўчастковых выбарчых камісій.

Палітсавет АДС падкрэслівае, што ў выпадку невыканання гэтых умоў выбары ў Палату прадстаўнікоў не могуць лічыцца празрыстымі, раўнапраўнымі і справядлівымі, а іх вынікі — прызнаны дэмакратычнымі сіламі, беларускім грамадствам і міжнароднай грамадскасцю.

**Сяргей КАРАЛЕВІЧ.**

ЧУЛІ?

## Прыгавор выкананы

**Нягледзячы на шматлікія заклікі еўрапейскіх праваабаронцаў, прыведзены ў выкананне прыгавор Вярхоўнага суда ў дачыненні да трох лідэраў гомельскай злачыннай групоўкі — Сяргея Марозава, Валерыя Гарбатага і Ігара Данчанкі. Пра гэта БелаПАН паведаміла прэс-сакратар суда Анастасія Цімановіч.**

*"Лідэр банды Марозаў усяляк адцягваў момант прывядзення ў выкананне прыгавора, — дадаў адвакат, які не назваўся. — Ён "успамінаў" аб новых эпізодах злачыннай дзейнасці, абяцаў назваць высокапастаўленых чыноўнікаў абласнога і рэспубліканскага рангаў, якія садзейнічалі таму, што члены банды так доўга дзейнічалі беспакарана. Марозаў спрабаваў захаваць сваё жыццё, напэўна, спадзяваўся, што ў Беларусі аб'явяць мараторый на смяротнае пакаранне".*

Аналогичное решение приняла и Парламентская ассамблея ОБСЕ. Ее председатель Йоран Леннмаркер уведомил спикера Госдумы Бориса Грызлова, что европейские депутаты не могут принять предложение российских коллег наблюдать за ходом президентских выборов 2 марта 2008 года. *"Мы сожалеем, что обстоятельства препятствуют нашему участию в наблюдении за выборами президента России"*, — заявил генеральный секретарь ПА ОБСЕ Спенсер Оливер.

Главным камнем преткновения стало требование БДИПЧ допустить в Россию основную группу из 50 наблюдателей с 15 февраля.

ЦИК изначально рассчитывал, что наблюдатели приступят к работе за три-четыре дня до выборов, но в ходе переговоров смягчил позицию и предложил начать мониторинг с 20 февраля. Однако БДИПЧ настаивало на указанном им сроке.

Как заявил ранее официальный представитель организации Кертис Бадден, начало работы за две недели до выборов было принципиальным условием, так как именно долгосрочный мониторинг выборов является узкой специализацией Бюро, и невозможность его проведения лишает смысла всю миссию.

Министр иностранных дел России Сергей Лавров назвал данную позицию *"ультиматумом"* и заявил, что БДИПЧ ведет себя *"жестко и невежливо"*.

## «Чистое небо» над Евросоюзом

"Чистое небо" — так называется совместный проект Еврокомиссии, предприятий авиастроительной промышленности и исследовательских институтов, о запуске которого было объявлено в Брюсселе. Его цель заключается в том, чтобы уменьшить негативное воздействие авиации на окружающую среду. Программа с бюджетом в 1,6 миллиарда евро рассчитана на 7 лет и станет самым крупным исследовательским проектом в своей области.

*"Сегодня аэронавтика составляет примерно 3% выбросов углекислого газа в мире,* — говорит комиссар ЕС по науке и исследованиям Янес Поточник. — *Однако с ростом числа пассажиров, которое увеличивается ежегодно на 5%, уровень выбросов будет расти в ближайшие десятилетия. Именно поэтому мы должны действовать сейчас".*

Одним из основных стратегических направлений программы станет развитие экологически менее вредных авиационных технологий, которые позволят к 2020 году на 50% снизить объем выбрасываемого самолетами в атмосферу углекислого газа, на 80% сократить выбросы оксидов азота, а также наполовину уменьшить уровень производимого самолетами шума.

Еврокомиссия рассчитывает, что новые технологии будут разработаны к 2010 году, что позволит к 2015 году приступить к созданию нового поколения авиатехники — более чистой и менее шумной.

## Джон Маккейн уходит в отрыв

Более 20 американских штатов подвели итоги голосования за кандидатов в президенты от Демократической и Республиканской партий. По обнародованным данным, "супервторник" вывел в лидеры среди республиканцев сенатора Джона Маккейна. У демократов, как и ожидали, безоговорочного победителя не оказалось. Хиллари Клинтон с небольшим отрывом опережает чернокожего сенатора Барака Обаму, и их битва обещает затянуться. Раскол в Демократической партии грозит поражением на ноябрьских выборах, предупреждает иностранная пресса, и впору ожидать, что следующим президентом станет именно Маккейн.

Итоги праймериз знаменуют начало второго этапа острого соперничества в стане демократов — самого тяжелого на памяти нынешнего поколения, пишет британская The Times. Хиллари Клинтон без труда одержала верх в Оклахоме, Теннеси и Арканзасе, а затем в Нью-Йорке, который она представляет в Сенате. Бывшую первую леди поддержал и Нью-Джерси — ключевое поле битвы на востоке США. Обама вышел вперед в южных штатах, а также в родном Иллинойсе.

Ни Обама, ни Клинтон не получили пока решающего преимущества — у них почти равное число делегатов. Схватка может продолжаться едва ли не до августовского партийного съезда, где определится победитель, и это тревожит демократов, отмечает газета. В прошлом, когда имел место подобный конфликт, они неизменно проигрывали



президентскую гонку.

Победа сенатора-республиканца Джона Маккейна была, по мнению The Times, предсказуемой. Он победил в 9 штатах, среди которых самые урожайные по делегатам — Калифорния, Нью-Йорк и Иллинойс. Он завоевал большинство голосов и в Аризоне, Коннектикуте, Делавере, Миссури, Нью-Джерси и Оклахоме.

С этого момента пути двух партий расходятся, делает вывод The New York Times. Республиканцам теперь значительно легче будет объединить силы, в то время как над демократами нависла угроза раскола. Настала пора переходить от борьбы за выдвижение кандидата к основной фазе президентских выборов, и в этих условиях Маккейн выиграл время, чтобы укрепить свои позиции, указывает издание. Пока нельзя говорить о полной победе, однако теперь он сможет заручиться поддержкой консерваторов и хорошо подготовиться к битве за Белый дом.

Положение демократов менее благоприятно, отмечает газета. Выбирая между черным мужчиной и белой женщиной, чернокожие избиратели и белые мужчины отождествляют себя с Обамой и в подавляющем большинстве голосуют за него. Зато голоса женщин по большей части отошли к Клинтон.

По словам обозревателя Адама Нагорни, жесткие стычки за выдвижение единого кандидата могут истощить силу партии, а это даст Маккейну шанс на победу. Впрочем, судьба выборов отнюдь не предрешена. В последнее время демократы менее остро критикуют друг друга — как бы ни кипели страсти, их сплотило общее желание отвоевать Белый дом, и оно остается главным козырем Демократической партии в предстоящей борьбе.

"Чего же ждут американцы от своего следующего президента?" — задается вопросом Der Tagesspiegel. И отвечает: самая насущная сегодня внешнеполитическая тема — имидж Америки, ее репутация и влияние в мире — сильнее всего сказалась на предвыборной кампании. Американцы хотят не только такого президента, который смог бы объединить страну, но такого, который позволит гражданам гордиться ею. Потому-то затасканный американский предвыборный лозунг "Мы хотим изменений!" в этом году действительно приобрел смысл, резюмирует обозреватель немецкого издания.

## КАЛЕЙДОСКОП

### Банк забыли закрыть

**Филиал одного из крупнейших банков в мире — британского HSBC, считающегося эталоном в сфере использования систем безопасности, оставался открытым и не охранялся почти сутки, в чем смог убедиться беспрепятственно проникший туда пятилетний мальчик, пишет британское издание Daily Mail.**

Он дожидался, пока его отец получит наличные из расположенного рядом с входом в банк автомата. Из любопытства мальчик толкнул дверь финансового учреждения и, поскольку она оказалась незапертой, вошел внутрь и устроил там небольшую экскурсию.

Выйдя из банка, Оливер пригласил своего отца исследовать совершенно безлюдное помещение.

"Мы беспрепятственно подошли к большому сейфу. Повсюду были компьютеры, лежало много съемных жестких дисков. Любой мог беспрепятственно их украсть. Стоит ли удивляться, что у нас постоянно пропадают базы данных", — рассказал ошеломленный господин Петтигрю журналистам, имея в виду захлестнувшую в последние месяцы Великобританию волну происшествий, связанных с утерями носителей с личными данными граждан.

Будучи законопослушным гражданином, Петтигрю позвонил в полицию и охранял вход в банк до прибытия полицейских.

### Похудел на 223 килограмма

**Американец Джон Лапиц продемонстрировал невиданную силу воли. С помощью диеты и физических упражнений он сумел похудеть на 223 килограмма.**

Ранее 68-летний Лапиц весил около 300 кило. Из-за избыточного веса у него начались серьезные проблемы со здоровьем. Он почти лишился возможности самостоятельно передвигаться и пять лет провел, практически не вставая с постели.

Когда Лапиц испугался, что без посторонней помощи не сможет даже сходить в туалет, он решил урезать свой ежедневный рацион наполовину. Сначала мужчина по-прежнему ел гамбургеры, но затем попробовал и овощи.

Далее Лапиц начал тренировки — поначалу они заключались в пеших прогулках — от кровати до раковины на кухне. В конце концов толстяк стал проходить по 20 километров каждый день и потерял почти 220 килограммов. "Это заняло у меня пять лет", — говорит Лапиц.

Больше всех других результатов своего оздоровительного марафона Лапиц рад тому, что впервые за 20 лет смог поместиться в душевой кабине, передает РИА Новости.

### Фото обнаженной первой дамы Франции

**В испанском журнале DT появилась новая фотография обнаженной Карлы Бруни, теперь уже первой дамы Франции, — в туфлях на высоком каблуке и с обручальным кольцом на безымянном пальце, пишут французские СМИ.**

Ранее, в январе, в этом же испанском мужском журнале появилась фотография обнаженной певицы и бывшей топ-модели Бруни в черных ботфортах и с обручальным кольцом на безымянном пальце левой руки. Редакция журнала уверяла, что обручальное кольцо не имеет ничего общего с романом Бруни и Саркози, так как фотографии были сделаны "значительно раньше их знакомства". По некоторым данным, эти фотографии Бруни были сделаны во время фотосессии Vogue а августе 2007 года.

### Японцы научились управлять бытовой техникой силой мысли

**В Японии успешно испытана уникальная система управления бытовыми электроприборами одной только силой мысли.**

Как сообщают СМИ, система разработана прежде всего для людей с нарушенными двигательными функциями. В ходе экспериментов парализованные пациенты могли самостоятельно переключать каналы и регулировать звук телевизора, включать и выключать свет, выводить текст на монитор компьютера и запускать домашнего робота-помощника.

Электромагнитные волны, излучаемые мозгом в процессе мышления, улавливаются прикрепленными к голове 10 датчиками. Затем через специальный приемник они передаются в компьютер, где преобразуются в цифровой сигнал, который с помощью инфракрасных лучей отсылается в электрическое устройство. Чтобы система могла распознавать, о чем именно подумал человек, каждая команда выражена в виде одной или нескольких букв, которые отображены на мониторе перед глазами пациента. Например, включение телевизора обозначено буквой "А". То есть при взгляде на эту букву мозг излучает определенную электромагнитную волну, которая улавливается датчиками. Скорость, с которой мысль превращается в конкретное действие, составляет около 15 секунд. Сообщается, что с помощью этой системы можно также выходить в Интернет и общаться в сети.

## ФОТОВЗГЛЯД

**Множество детей в Афганистане ожидают гуманитарной помощи ООН.**

**В Японии холодная погода на руку организаторам фестиваля ледяных скульптур.**

## Языковая дискуссия МИДов

**Как уже сообщалось, Минкульт Украины запретил показ и распространение фильмов без украинского дубляжа. Это сильно не понравилось России.**

Министерство культуры и туризма Украины в приказе №1 от 18 января 2008 года запретило Государственной службе кинематографии страны выдавать разрешение на распространение и демонстрирование фильмов, не дублированных на украинский язык. Ранее демонстрация и распространение фильмов, не дублированных на украинский язык, была разрешена, но было необходимо наличие субтитров на украинском языке.

Напомним, что в 2006 году украинское правительство приняло постановление о переходе на украиноязычный прокат кинофильмов в начале 2008 года. В конце 2007 года Конституционный суд утвердил решение Кабинета министров, согласно которому 100 процентов иностранных фильмов, выходящих в украинский прокат, должны быть переведены на государственный язык либо быть запущены в прокат с русским дубляжом, но в сопровождении украинских субтитров.

Это решение не понравилось России. По данному вопросу даже появился комментарий МИД РФ от 9 января текущего года. В нем отмечалось, что решение украинской стороны "вызывает озабоченность" и, по мнению Москвы, свидетельствует о нежелании украинских властей выполнять свои международные обязательства, в частности, Европейскую хартию региональных языков.

Киев между тем заявляет, что российская сторона снова пытается "искусственно обострить языковой вопрос в украинском государстве". "Очевидно, такая кампания имеет целью дезориентировать международное сообщество и внести элемент нестабильности в межнациональные отношения", — считает МИД Украины. Ведомство отмечает, что не получало каких-либо нареканий со стороны Совета Европы, связанных с возможными нарушениями Европейской хартии региональных языков.

Решение КС, запретившего распространять и демонстрировать в Украине иностранные фильмы, если они не дублированы или не снабжены субтитрами на государственном языке, — украинский МИД расценил как "логическое завершение" государственной политики в сфере кинематографии. "Развитие кинематографии и поддержка украинского языка являются внутренним делом нашего государства, — заявляет Киев, — следовательно, поведение МИД РФ, по меньшей мере, некорректно".

*По материалам зарубежных СМИ.*

## Еврокомиссия намерена облегчить жизнь мелкому и среднему бизнесу

**Комиссар ЕС по промышленности Гюнтер Ферхойген объявил о запуске специальной программы по поддержке мелких и средних компаний.**

Сеть "Энтерпрайз Юроп Нетуорк" объединяет усилия более 500 европейских организаций — от торговых палат и агентств регионального развития до университетских центров. Услуги компаниям будут оказываться бесплатно и по принципу "одного окна".

*"Речь не идет об одностороннем шаге вперед, — заявил Ферхойген. — Мы хотим выслушать и компании и призываем их сказать, в каких областях существуют сложности или различия"*. Собранная информация будет учтена при разработке нового европейского законопроекта, который будет направлен на развитие малого и среднего бизнеса. Как ожидается, его представят в июне этого года.

*"Я думаю, что главным принципом должно быть коренное изменение процедурной политики,* — говорит глава Союза европейских торговых палат. — *Во многих государствах ЕС действующие и одобренные в настоящее время законы и правила основаны на интересах делового сообщества в целом. Теперь интересы этих сообществ должны стать интересами мелкого бизнеса"*.

## Более 150 улиц лишились советских названий

**В столице Казахстана Астане вступило в силу решение городских властей о переименовании 155 улиц. Об этом сообщает ИА "АКИ-press".**

Как отмечает агентство, некоторые русскоязычные названия, оставшиеся со времен СССР, изменены на казахские эквиваленты, другим улицам присвоены имена героев национального эпоса и исторических личностей республики.

## Уже в ближайшем будущем по всей Туркмении будут установлены памятники выдающимся людям страны

**Местные СМИ опубликовали текст постановления президента Туркмении Гурбангулы Бердымухамедова, возглавившего специальную комиссию, которая определит перечень личностей, памятники которым будут устанавливаться в Ашхабаде и велаятах (областях) страны.**

Согласно документу, памятники будут устанавливаться *"в целях воспитания молодого поколения в духе патриотизма, уважения богатейшего историко-культурного наследия нации, дальнейшего улучшения архитектурного облика столицы, городов и сел Туркмении"*.

Также планируется, что в Ашхабаде будет построен новый комплекс культуры и отдыха, где будут регулярно проводиться вечера поэзии и встречи с мастерами культуры и искусства.

Прославившие туркменский народ великие исторические личности будут изображены также на новых банкнотах национальной валюты — манатах, которые войдут в денежное обращение в 2009 году в связи с предстоящей деноминацией. В годы независимости на всех денежных купюрах был изображен исключительно первый президент страны Сапармурат Ниязов, которому при жизни были поставлены сотни памятников по всей стране.

## «Волшебная флейта» в метро

**Продюсер и дирижер Кристоф Хагель собирается поставить оперу Моцарта "Волшебная флейта" в берлинской подземке. Сценой и залом на 600 зрителей послужит недействующая станция "Бундестаг", расположенная на 20-метровой глубине между зданиями Рейхстага и ведомством федерального канцлера.**

В оперном проекте участвует Берлинский симфонический оркестр. Представления пройдут с 27 апреля по 25 мая текущего года. Хагель известен тем, что уже не раз выбирал для оперных постановок необычные места. В 1990-е годы вместе с режиссером Джорджем Табори он уже ставил "Волшебную флейту" Моцарта — в цирковом шатре. Позже последовала постановка "Дона Джованни" в сотрудничестве с режиссером Катариной Тальбах в берлинском техно-клубе E-Werk, расположенном в здании бывшей трансформаторной подстанции.

В городе живет достаточно людей, которые ежедневно немало времени проводят в метро, объясняет свой замысел Хагель. По его словам, разветвленная сеть туннелей и станций — этот фантастический мир — является частью их будней. Начало оперы больше напоминает сюжет современного кинофильма. Девушка-панк Памина в автомате делает фотографии на паспорт. Одну из них она теряет. Чуть позже снимок находит Тамино, студент философии в университете имени Гумбольдта. Он воспевает красоту незнакомки, и так любовная история получает свое развитие.

Проект готовится при поддержке берлинского предприятия общественного транспорта BVG. Однако участие компании не ограничивается финансированием постановки. В оперном хоре заняты также и сотрудники BVG, поющие в любительском хоре предприятия. А билет на оперу можно будет приобрести в любой кассе метро. Причем выглядит он как обычный билет на проезд, только вместо зоны "АВ" или "АВС" будет стоять "Волшебная флейта".

Народная Воля http://www.nv-online.info
14 ЛЮТАГА 2008 г.

Галіна Пазьняк

# Беларусь у сэрцы

(Працяг. Пачатак у №№7—8, 9—10.)

## УСЕБЕЛАРУСКІ СТРАЙК 1991 ГОДА

У красавіку 1991-га (а гэта яшчэ існаваў СССР і кіруючая КПСС) уся Беларусь была ахопленая стыхійнымі страйкамі рабочых, якія пратэставалі супраць гвалтоўнага павышэньня цэнаў і нізкага ўзроўню жыцьця. Гэта быў гістарычны момант і шанец, які мы, беларусы, тады, на жаль, напоўніцу не скарысталі.

Якраз у гэты час лідэры Народнага Фронту Зянон Пазьняк, Лявон Баршчэўскі і Мікалай Заблоцкі знаходзіліся ў Злучаных Штатах з важнай місіяй: прарыў інфармацыйнай блякады Беларусі, зацьвярджэньне яе суверэнітэту ў міжнароднай палітыцы, прыцягненьне ўвагі да малавядомай у сьвеце дзяржавы Беларусь. Справу яны рабілі важную і пасьпяхова. Пазьняк тэлефанаваў і размаўляў з сябрамі дэпутацкай Апазыцыі БНФ, з В. Голубевым і іншымі, раіў, падказваў, што трэба рабіць. На той час імгненна вярнуцца з-за акіяна (прытым тады можна было толькі праз Маскву ці Ленінград ды з перасадкамі ў аэрапартах) лідэры не змаглі б. Пазьняк падлічыў, што страцілі б на ўсю валакіту вяртаньня да Менска, мінімум чатыры дні. Стыхія актыўна трымалася б, на яго думку, ня больш двух дзён. Жалеза трэба каваць напачатку, калі гарачае. Прыехаць позна па пажары "на галавешкі" — было бяссэнсоўна. Падзеі паказалі, што кіраўнікі Фронту не памыліліся ў сваіх меркаваньнях. Але як жа не хапала іх тады на Беларусі...

Страйк імгненна ахапіў многія буйныя гарады Беларусі. У першы дзень страйку адбывалася сэсія Менгарсавета. Мы выбеглі з залі паседжаньняў у калідор, каб праз вокны ўбачыць рух калёнаў рабочых на плошчу Незалежнасьці.

Памятаю, як перапужаліся камуністы і чыноўнікі ў Гарвыканкаме. З розных канцоў Менска, з розных заводаў ішлі велізарныя калёны рабочых. Відовішча ўражвала. Да Дому ўраду рухаліся тры велізарныя калёны: адна — з вуліцы Сьвярдлова; як шырокая рака, плыў людзкі вал па мосьце з вуліцы Маскоўскай; і такая самая людзкая рака рашуча набліжалася да плошчы Незалежнасьці (тады плошчы Леніна) з праспэкта Скарыны (тады праспэкта Леніна). Рабочыя былі настроеныя вельмі рашуча. Уся велізарная плошча ў цэнтры Менска запоўнілася людзьмі (а гэта тысяч трыста, ня менш).

Я адразу вырашыла пакінуць сэсію і йсьці на плошчу. Са мной разам спачатку з гарсавета не пайшоў ніхто, толькі праз нейкі час некалькі дэпутатаў таксама зьявілася на плошчы. Мяне ж спрабавалі спыніць: "Галіна Фёдараўна, ідзе сэсія, і ваш абавязак быць на ёй"; "Мы здымем з вас "дэпутацкія грошы". На што я адказвала: "Мой абавязак зараз быць там, на плошчы, са сваімі выбаршчыкамі. А грошы — пры чым тут грошы, калі вырашаецца лёс Бацькаўшчыны!"

Народу было вельмі шмат. Практычна ўся плошча была запоўненая (такой колькасьці, як у той дзень, на плошчы Незалежнасьці я больш ня бачыла ніколі). Людзі стаялі, некаторыя сядзелі на асфальце, падаслаўшы газэту.

Многія сябры Страйкаму і Рабочага Саюзу ведалі мяне як фронтаўку і як дэпутата, таму убачыўшы, прапанавалі "ўзначаліць" рабочую дэлегацыю на сэсію Гарсавета. Я пагадзілася. Стыхійна вылучылі чалавек пяць (у асноўным — жанчын, якія былі больш сьмелыя), і мы імкліва сьціраваліся да будынку Гарвыканкама. На 4-м паверсе, дзе ў вялікай залі ішла сэсія, рабочых прыпынілі працаўнікі Выканкама, якія заўсёды сталялі каля ўваходу ў залю падчас сэсіі. Я рашуча сказала, што гэтая дэлегацыя са мной, і мне ніхто не адважыўся запярэчыць.

Мы ўвайшлі ў залю. Я падняла руку і зьвярнулася да вядучага А. С. Герасіменкі і дэпутатаў: "Шаноўнае спадарства! Вы ведаеце, што пачаўся ўсебеларускі страйк. Рабочыя на плошчы (якіх сотні тысячаў) накіроўваюць на нашу сэсію сваіх прадстаўнікоў са зваротам да нас, дэпутатаў. Гэта нашыя выбаршчыкі, і мы, іхныя абраньнікі, ня можам ігнараваць іхны зварот да нас. Патрабую прыпыніць сэсію і даць слова дэлегатам".

Вочы Аляксандра Міхайлавіча акругліліся ад жаху, але ня выканаць патрабаваньня ён ня змог — настолькі рашуча мы выглядалі. Ён "здрыгануўся", калі не сказаць спужаўся. Вялікі сполах чытаўся на твары ня толькі Старшыні Гарсавета — твары ўсяго начальства і намэнклятуры выканкама, якой у залі было поўна, проста "перакасіла".

Ужо прадстаўнікі дэлегацыі выступаюць з дэпутацкай трыбуны, але выступы, на жаль, былі непадрыхтаваныя. Рабочыя выказвалі сваё абурэньне неверагодным ростам цэнаў, ростам беспрацоўя і г.д. — словам, патрабавалі палепшыць матэрыяльнае жыцьцё. Выступілі, выказалі абурэньне — і ўсё. Што рабіць далей — ніхто (у тым ліку і я) ня ведалі. І мы з высока паднятымі галовамі праз усю залю годна пайшлі назад, на плошчу. (Дарэчы, гэты выпадак так моцна напужаў кіраўніцтва Выканкама і Гарсавета, што на працягу амаль пяці гадоў сэсія ніколі не прызначалася на "ненадзейныя" дні-месяцы, у пэрыяд нейкай, зь іх пункту гледжаньня, народнай ці фронтаўскай "нестабільнасьці", калі высьпявалі ці адбываліся мітынгі ці страйкі.)

Тым часам пачаўся мітынг. Выступалі разгневаныя рабочыя. Плошча патрабавала кіраўнікоў дзяржавы. Зьявіўся прэм'ер-міністар Кебіч. І тут ён адразу пачуў усё, што думалі пра яго і ягоны ўрад простыя людзі, якія выказвалі сваё абурэньне і нянавісьць да камуністычнай улады.

На пачатку рабочага страйку не было ні палітычных патрабаваньняў, ні нацыянальнай сымволікі. Пачыналася ўсё з патрабаваньняў эканамічных. Але паступова па ініцыятыве Народнага Фронту на плошчы зьявіліся Бел-Чырвона-Белыя сьцягі, рабочыя пачалі выстаўляць і палітычныя патрабаваньні. Трэба адзначыць, што ў той час арганізацыі Беларускага Народнага Фронту былі ўжо амаль на ўсіх буйных прадпрыемствах Менска. Ля вытокаў і ў аснове арганізацыі Рабочага Саюзу стаялі таксама рабочыя-фронтаўцы сябры Сойму БНФ Сяргей Антончык, Алесь Галькевіч, Міхаіл Мухін, Міхась Собаль і іншыя рабочыя лідэры. Гэта яны якраз упарадкавалі рабочы пратэст і скіравалі (практычна прывялі) людзей на плошчу Незалежнасьці да Дому Ураду.

Людзей было шмат, не хапала толькі лідэра ці "лідэрскага кулака", які б дзейнічаў рашуча, хутка і пераканана. Здавалася, такія людзі былі, яны стаялі тут, на плошчы. Гэта і Валянцін Голубеў, і Віктар Івашкевіч, і шмат хто яшчэ, хто мог бы ў той сытуацыі ўзяць на сябе адказнасьць і павесьці народ на дзеяньні. Але ніхто не рашыўся. Мне здаецца, што (асабліва ў першы дзень) людзі гатовыя былі дзейнічаць востра і актыўна. Трэба было скарыстаць момант.

Усе былі надзвычай ўзбуджаныя. Многія лічылі, што камуністы ўжо пераможаныя. З асаблівай надзеяй я паглядала на свайго сябра Валянціна Голубева. Актыўны дэпутат Апазыцыі, паплечнік Пазьняка, хто, калі ня ён, зараз павядзе за сабой. Але нічога не атрымалася. ("Амбіцыі" спрацуюць потым, значна пазьней.)

Страшэнна балюча было назіраць, як зьнікае шанец, сыходзіць з-пад самых рук... Страйк паказаў усім (хоць "усе", магчыма, гэтага і "ня ўбачылі"), што адной толькі масай, нават вельмі вялікай, яшчэ нічога ня зробіш. Патрэбная вялікая змагарная ідэя, якая яднае ўсіх, і чалавек, які павядзе, дакладней, — які возьме на сябе адказнасьць і якога прызнаюць (бо павесьці часта імкнуцца і дурні, прытым у тупік). Памятаю, як да вечара людзі стаялі на плошчы. Пачаліся прамовы, але "прамоўцаў" не хапала. Выступалі многія дэпутаты Вярхоўнага Савета, гарадзкога Савета — выступалі ўсе, хто ўмеў гаварыць прамовы, і хто ня ўмеў.

Тым часам ішлі паведамленьні, што наш страйк падтрымалі рабочыя Оршы і іншых гарадоў Беларусі. Людзі бурна рэагавалі апладысментамі. Пакідаць плошчу рабочыя не зьбіраліся, яны як бы чакалі закліку, па якому б пайшла ўся плошча, але ніякага закліку ні ад каго не было. Здавалася, час цягнуўся вельмі марудна ці зусім спыніўся. Што рабіць далей — ня ведаў ніхто.

А потым вырашылі ісьці да тэлебачаньня і патрабаваць простага эфіру. І людзі рушылі велізарнай калёнай.

Уся плошча Перамогі запоўнілася людзьмі. Але дакладнага пляну дзеяньняў не было. Тут таксама не знайшлося арганізатараў, якія б дакладна акрэсьлілі мэты і задачы. У вачох многіх людзей было пытаньне: "Што далей?" А што рабіць — ніхто ня ведаў.

Сябры прапанавалі: "Галя, чытай вершы!" Я чытала, нешта гаварыла. Але ня тое трэ было рабіць, і ня вершы чытаць.

Тым часам дэлегацыя накіравалася ў будынак тэлецэнтра з патрабаваньнямі эфіру. Але гэтае "патрабаваньне" хутчэй можна было назваць просьбай. Натуральна, ніхто ня кінуўся даваць ім эфір, а ў дэлегацыі настойлівасьці не было, яны тут жа і абвялі. Незнаёмая мне жанчына з рабочых раптам зьвярнулася да мяне: "Трэба сёньня дамагацца ад ураду ўсяго, бо сёньня мы, рабочыя, пойдзем за вамі і, калі трэба, разьнясём гэты тэлецэнтар па цагліне. Заўтра можа быць позна, няўжо ж вы гэтага не разумееце?"

Але ў першы дзень мы нічога не дамагліся: катастрафічна не хапала лідэра. Назаўтра рабочыя зноў прыйшлі на плошчу, але іх ужо было крыху меней. На трэці дзень быў дождж, людзі стаялі на плошчы, але міліцыя ўжо адгарадзіла жалезнымі штакецінамі будынак ураду ад плошчы. Прамоўцы нешта патрабавалі, пісалі звароты, пасылалі дэлегацыі ва ўрад. Але час быў страчаны, улады "апамяталіся", страйк пайшоў на спад.

## КАМІСІЯ ПА АДУКАЦЫІ

Жыцьцё працягвалася, і мы прадаўжалі сваё змаганьне. Апазыцыя БНФ у Вярхоўным Савеце патрабавала ад Савета Міністраў новых падручнікаў, каб выкладаньне ў школах, ВНУ пераходзіла на дзяржаўную мову. Савет Міністраў (на чале з В. Кебічам) рабіў выгляд, што зьбіраецца ўводзіць Закон "Аб мовах" у жыцьцё. Але было відавочна, што ўлада сабатуе Закон.

За беларускую школу, беларускі дзіцячы садок у Менску змагаліся і мы ў Гарсавеце. Гэтым займалася дэпутацкая Камісія па адукацыі на чале з заслужанай настаўніцай Беларусі Вольгай Кузьміч. Па прыродзе чалавек дабразычлівы, чулы, памяркоўны, яна ўмела знайсьці паразуменьне і схіліць на свой бок людзей розных характараў і поглядаў.

Камісія была адной з найбольш шматлікіх, а ў яе складзе — дырэктары школаў, кіраўнікі навучальных установаў, настаўнікі, пэдагогі. Людзі (у асноўным), падпарадкаваныя ўладзе, залежныя, якія (у большасьці) трымаліся ідэалягічнага накірунку кампартыі ў савецкія часы. Кіраваць такімі людзьмі надзвычай цяжка. Таму не перастаю зьдзіўляцца майстэрству Вольгі Кузьміч, якая змагла аб'яднаць дэпутатаў з супрацьлеглымі поглядамі, часам надзвычай амбіцыйных "кіраўнікоў" (у асноўным — адданых уладзе), і ськіраваць працу Камісіі на тое, каб гэты працэс беларусізацыі сталічных школаў і дашкольных дзіцячых ўстановаў рухаўся, і даволі хутка.

Не хапала падручнікаў, не хапала метадычнай літаратуры, але ад Камісіі зыходзіла такая перакананасьць і пасьлядоўнасьць дзеяньняў, што школы Менска хутка пачалі пераходзіць на беларускую мову і набываць статус беларускамоўных. Ня ўсё задавальняла ў гэтым працэсе, але і ня ўсё залежыла ад нас.

У самым пачатку нашай дэпутацкай дзейнасьці (1990 г., калі яшчэ быў СССР і "ўсяўладная" КПСС) у Камісію па адукацыі Менгарсавета зьвярнуўся за дапамогай атрымаць памяшканьне адзін з ініцыятараў стварэньня беларускага ліцэю з фізіка-матэматычным ухілам пры БДУ А.І.Жук. Мы актыўна іх падтрымалі. Без партыйнага кіраўніцтва вырашыць гэтае пытаньне (як і ўсё астатняе) тады было немагчыма. Усё вырашала "партыя", і мы зьвярнуліся туды. Памятаю наш (трох дэпутатаў) візыт у ЦК КПБ з патрабаваньнем дапамагчы ў выдзяленьні будынка для ліцэя. Нас прыняў адзін з сакратароў ЦК КПБ камуністычны артадокс Камай, які з-за вялікага стала вынес свой вердыкт: "Я ліцэяў не канчаў, кароў і авечак пасьвіў, а бачыце, чаго дасягнуў".

З памяшканьнем ён не дапамог, нават наступная сустрэча, пра якую мы дамовіліся, не адбылася. Сакратарка нам паведаміла, што "таварыш Камай заняты і прыняць нас ня можа" (тыповы стыль камуністаў), але і перашкодзіць ня здолеў: ня тыя часы. Пад націскам дэпутатаў Камісіі па адукацыі Менгарсавета Беларускі ліцэй пры БДУ з фізіка-матэматычным ухілам атрымаў памяшканьне. Але прайшоў час, і тыя, хто ўзначаліў ліцэй (асабіста А. І. Жук) і біў сябе ў грудзі, што ён будзе беларускамоўнай навучальнай установай (толькі, маўляў, дапамажыце з памяшканьнем), здрадзілі нашаму змаганьню і перайшлі на чужую, на расейскую мову... Была і, на жаль, не пераводзіцца цяпер такая зьява ў нашым жыцьці.

Крыху пазьней быў адчынены яшчэ адзін ліцэй — Гуманітарны. Пра гэта піша ў сваёй кнізе "Сем гадоў Адраджэньня..." Сяргей Навумчык: "Дзякуючы намаганьням Камісіі па культуры і захаваньні гістарычнай спадчыны Вярхоўнага Савета, у лістападзе 1991-га Міністэрствам адукацыі на базе ранейшага нядзельнага ліцэю ствараецца Беларускі гуманітарны ліцэй. А 15 студзеня 1992 г. распараджэньнем Савета Міністраў яму перадаецца будынак на Кірава, 21". (С.Навумчык. Сем гадоў Адраджэньня...", — Варшава—Прага, 2006, стар. 75).

Усё так. Дадам толькі, што так званую "падрыхтоўчую" работу мы рабілі ўсе разам: і дэпутаты, і асабіста Н.Гілевіч, і А.Трусаў, і В.Кузьміч, і У.Колас, і ліцэісты. Разам з ліцэістамі мы выходзілі з плякатамі да Вярхоўнага Савету. Ліцэісты размаўлялі з дэпутатамі, калі тыя ў перапынку выходзілі на намэнклятурны "перакур", зьвярталіся да іх, пераконвалі, каб яны паспрыялі стварэньню Ліцэя. А каб дзяцей не адштурхнула міліцыя, зь імі былі мы, дэпутаты Гарсавета.

Распараджэньне аб стварэньні Ліцэя было прынята. Аднак не было памяшканьня, і знайсьці яго маглі толькі гарадзкія ўлады, на якія нам, дэпутатам, трэба было ціснуць і ціснуць. У.Колас ня раз прыходзіў у Гарвыканкам да Вольгі Кузьміч за падтрымкай, і тут яна асабіста зрабіла вельмі шмат: бясконца "дзяўбла" старшыню Гарвыканкама, пераконвала, прасіла, настойвала, нагадвала пра ліцэй.

Трэба сказаць, што там, дзе спрыяньне ня йшло ў разрэз з Саўмінам, А.М.Герасіменка спрыяў беларускай справе. Таму, дзякуючы моцнай падтрымцы В.Кузьміч, удалося дамагчыся таго, што горад гэтай праблемай заняўся шчыльна. У гэтым пытаньні А.М.Герасіменка сапраўды пастараўся.

Канчатковая ідэя пра будынак на Кірава, 21 была яго, і рашэньне было прынята Саўмінам ня проста "зь неба", а дзякуючы вялікай сумеснай беларускай працы. (Так бы заўсёды!)

З Лукашэнкам прыйшоў новы тып чыноўніка-разбуральніка, і сёньня Беларуская мова распараджэньнем Міністэрства адукацыі (дзе міністар Бурачкоў) да пачатку новага (2007/2008) навучальнага года ўжо выводзіцца з ужытку ў тэхнічных ВНУ. Прынята адпаведная пастанова, нягледзячы нават на тое, што Лукашэнкава "палата" прызнала гэта незаконным. Злачынная акцыя выклікала абурэньне грамадзкасьці, ТБМ зьвярнулася да Міністэрства з запытам — яно не адказвае, яно мовай беларускага народа расплачваецца з Масквой (называе гэтую здраду — "у рамках "саюзных" стандартаў"). А беларусы ўсё ня бачаць, што гэта і ёсьць разбурэньне суверэнітэту без ужываньня зброі...

Шмат намаганьняў прыклала Камісія па адукацыі для арганізацыі тэлемарафону (1991 г.) у падтрымку беларускай школы, сродкі ад якога потым былі накіраваныя на разьвіцьцё беларускага навучаньня. Мы ўсяляк прапагандавалі школы, якія шчыра дзейнічалі ў рэчышчы Адраджэньня. Актыўным ініцыятарам усёй нашай дзейнасьці была, безумоўна, Вольга Кузьміч, у яе было 2—3 (усяго!) надзейныя памочнікі — і справа рухалася.

Калі нам было неабходна прыняць важнае рашэньне, Вользе дастаткова было папярэдзіць: "Заўтра на Камісіі быць неабходна", — і мы адкладалі ўсе іншыя справы.

Дзейнічала Камісія праз Гарадзкое Упраўленьне адукацыі (якое было нам як бы падпарадкавана і на якое мы мелі пэўны ўплыў). Падчас наведваньня школаў мы сустракалі шмат настаўнікаў-энтузіястаў, усяляк падтрымлівалі іх.

Па ініцыятыве Камісіі (а дакладней, Вольгі Кузьміч) у Фрунзенскім раёне Менска праводзіўся аналітычны зрэз па навучаньні фізікі і матэматыкі па-беларуску. Былі падабраныя клясы з аднолькавым "узроўнем пасьпяховасьці", але адны зь іх пачалі вучыцца па-беларуску, іншыя — працягвалі па-расейску. Вынікі далі нам вельмі істотны аргумант: дзеці, якія навучаліся па-беларуску, значна лепш авалодвалі прадметам.

На кожным паседжаньні Камісіі мы абмяркоўвалі пытаньні мовы, аналізавалі работу беларускамоўных (і рускамоўных) школаў горада. Каб выявіць, як уводзіцца Закон аб мовах, правяралі, ці пасьпяхова школы пераходзяць на родную мову, на якой мове афармляецца дакумэнтацыя ў школах і г.д. Нас, некалькі ініцыятыўных чалавек, ня трэба было ні прымушаць езьдзіць па школах горада, ні напамінаць — гэта сталася "асабістай справай".

Час "бег", і мы "беглі" за ім. Рабочы дзень быў перапоўнены. Пасада старшыні камісіі была "вызваленай", астатнія дэпутаты мусілі працаваць на сваёй асноўнай працы, але мы мелі права вызваляцца на дэпутацкія справы, і калі было неабходна, выкарыстоўвалі яго (ня кажучы пра "адпачынак"). Спраў было столькі, што пасьля першага году працы Вольга Кузьміч увесь свой адпачынак заставалася ў Гарсавеце. (Калі потым пра гэта даведаўся А. М. Герасіменка — старшыня Гарсавета, то па-добраму сварыўся на Вольгу. Але нярэдка такое паўтаралася і з Вольгай, і са мной, і з тымі, для каго справа Адраджэньня была найважнейшай.)

З мэтай пашырэньня і спрыяньня беларускай адукацыі мы сустракаліся з кіраўнікамі школаў, настаўнікамі. Каго агітавалі — ад каго патрабавалі. Удзельнічалі ў канфэрэнцыях, зьездах, выступалі ў СМІ. Гэта давала плён. Выявілася, што і бацькі, і настаўнікі ставіліся да працэсу адраджэньня беларускай школы з разуменьнем, успаміналі свае карані.

Камісія па адукацыі Менгарсавета пастаянна вывучала навучальна-выхаваўчы працэс у дзіцячых установах Менска. Ня раз наведвалі мы і школы-інтэрнаты, асабліва, дзе навучаюцца і жывуць дзеці-сіроты. У дзіцячым інтэрнаце Заводзкага раёна (здаецца, №5) мы з Вольгай Кузьміч убачылі шматлікія іхныя нястачы, бедную матэрыяльную базу. Трэба было зьвярнуць увагу дзяржавы да праблемаў дзяцей-сірот. Мы зьвярнуліся да Зянона Пазьняка як да дэпутата Вярхоўнага Савета дапамагчы нам у гэтым, і на сустрэчу з супрацоўнікамі і выхаванцамі інтэрнату мы ўжо паехалі разам зь ім. Фронт якраз атрымаў гуманітарную дапамогу з-за мяжы, зь якой мы і прыехалі ў інтэрнат. Памятаю, дзеці спэцыяльна для гэтай сустрэчы падрыхтавалі канцэрт.

1992 г. Галіна Пазьняк і Вольга Кузьміч.

Зянон Пазьняк размаўляў з настаўнікамі і дзецьмі, хадзіў па клясах, знаёміўся з так званым "спальным корпусам", абсталяваньнем і ў цэлым матэрыяльнай базай, нешта сабе занатоўваў. Сустрэча была вельмі цёплая. Тады Зянон Пазьняк паабяцаў дзецям, што калі яны будуць старацца добра скончыць навучальны год, то (як скончацца заняткі) ён наладзіць для іх вандроўку па Беларусі. Ня ведаю, ці спадзяваліся на гэтае абяцаньне занятага справамі дэпутата Вярхоўнага Савета дзеці, але ён стрымаў сваё слова. Фронт аплаціў аўтобус, і мы з дзецьмі-сіротамі адправіліся ў вандроўку па Беларусі (з запасам харчаваньня на дзень, пра што Старшыня Фронту таксама паклапаціўся загадзя). Гідам у гэтай вандроўцы быў таксама Зянон Пазьняк, расказваў дзецям пра помнікі гісторыі і культуры, пра знакамітых беларусаў. Нясьвіж, Мірскі замак, Заслаўе і па дарозе яшчэ шмат дзе пабывалі дзеці ў той памятны дзень. Такая вандроўка была для тых дзетак упершыню, яны былі вельмі ўражаныя і шчасьлівыя. Упэўнена, што гэты дзень ім запомніўся надоўга.

Ініцыятарам "камісійных" справаў на карысьць незалежнай Беларусі была старшыня Камісіі. Я старалася ўсімі сіламі дапамагаць ёй, тым больш што была сакратаром Камісіі. Актыўна дапамагалі нам у гэтай справе дэпутаты Валянціна Ерашэнка (загадчыца дзіцячага садка №56 Менска) і дацэнт Эканамічнага універсітэту Рыгор Ермашкевіч. Зь іншымі сябрамі Камісіі старшыня ўмела пабудаваць такія дачыненьні, што нават тыя, хто ў душы быў супраць беларускай мовы, адкрыта не рашаліся галасаваць па нейкім пытаньні "супраць".

Неўзабаве беларускіх школаў і дзіцячых дашкольных установаў у Менску сталася большасьць. Часам, ня ўсе зь іх адпавядалі свайму статусу "беларускамоўная школа", бо Закон ўводзіўся ў жыцьцё фактычна, дзякуючы энтузіязму пэўных канкрэтных людзей. Тут вельмі не хапала падтрымкі дзяржаўнай улады (Саўміну), якая моцна супраціўлялася любым праявам беларускасьці, зьнешне дэкларуючы падтрымку беларускай школы. Тым ня менш наша Камісія па адукацыі (адзіная) засталася вернай ідэі Адраджэньня да канца дэпутацкага тэрміну.

Неяк да нас у Камісію па адукацыі прыйшло некалькі чалавек рускамоўных настаўнікаў і "бацькоў" з патрабаваньнем. "Уберите этот ваш белорусский язык. Что за насилие. Мы граждане Беларуси, имеем все гражданские права и не собираемся говорить на вашем языке. У нас есть свой, русский!" — гістэрычна крычэлі актывісты "пятай калёны".

Здавалася, у кабінеце (дзе было працоўнае месца Вольгі Кузьміч і маё) шыбы лопнуць ад ляманту і крыку. Але лямантам нас спужаць было немагчыма. Мы добра ведалі Закон і змаглі так "адбіць" атаку, што тыя пайшлі, як кол праглынуўшы.

## КАМІСІЯ ПА КУЛЬТУРЫ І АДРАДЖЭНЬНІ ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ

Камісія па культуры Менгарсавета на пачатку нашай кадэнцыі была цалкам адраджэнцкая і пачынала таксама з энтузіязмам адраджаць беларускую культуру ў Менску.

Яе старшыня Ігар Чарняўскі меў вялікі аўтарытэт сярод дэпутатаў. Добра выхаваны, разумны і стрыманы, ён выклікаў павагу нават ў нашых праціўнікаў. Яго слова мела вагу, і таму шмат якія прапановы Камісіі, якія на сэсіі прадстаўляў Ігар, пры галасаваньні "праходзілі". Першыя 2—3 гады мы (яе сябры) гэтаксама, як і Камісія па адукацыі, дружна і плённа працавалі і змаглі разам дамагчыся шмат чаго.

У адрозьненьне ад Камісіі па адукацыі (дзе было шмат праціўнікаў адраджэньня), у склад Камісіі па культуры ўвайшлі ў асноўным прыхільнікі беларускага Адраджэньня. Тут былі аднадумцы, якія актыўна адгукаліся на праблемы разьвіцьця беларускай культуры. Дэпутат Андрэй Завадзкі, напрыклад, падрыхтаваў сэрыю прапановаў па зьмене ўсіх камуністычных назваў вуліц Менска, і мы, сябры камісіі, адзінадушна падтрымлівалі ягоныя праекты, каб, як кажуць, ўвасобіць яго прапановы ў жыцьцё. Але рашэньне па перайменаваньні вуліц Менска прымала выканаўчая ўлада (Выканкам). Курыраваў гэтыя пытаньні А.Сасноўскі, дэпутаты маглі толькі ўнесьці прапановы.

Каб ня даць ходу дэпутацкай ініцыятыве, спадар Сасноўскі ўтворыў сваю адмысловую грамадзкую "камісію" з "прафэсіяналаў" (яе назвы ня памятаю), а на справе са "сваіх" людзей, прыхільнікаў камуністаў, якія бляклавалі прапановы дэпутацкай Камісіі па культуры. Яны вырашалі, прадстаўляць праект рашэньня па зьмене назвы вуліц (прапановы дэпутацкай Камісіі) на зацьвярджэньне Гарвыканкаму ці не. Справа па перайменаваньні вуліц пачыналася з таго, што сп.Сасноўскі зьбіраў сваю адмысловую камісію, на якой дэпутатат зачытваў прапанову. Яе абмяркоўвалі і... не зацьвярджалі. За ўсім гэтым стаяў сам сп.Сасноўскі, які і не даваў разьвівацца працэсу перайменаваньня вуліцаў Менска. Адыёзныя назвы вуліц з імёнамі сьвярдловых, валадарскіх, урыцкіх і г.д. засталіся. Кебічаўская "дырэктыва" "вісела" перад іхнымі слабымі душамі і зачыняла ад іх усе самыя вялікія аргументы. Нічога зрабіць тут было немагчыма.

Перайменаваць удалося толькі праспэкт Леніна на праспэкт Скарыны і вуліцу Горкага на вуліцу Максіма Багдановіча, але за гэта было вельмі вялікае змаганьне.

У 1992 годзе ўвесь сьвет адзначаў 500-годдзе славутага беларуса Скарыны. Ужо пачалася ўрачыстая вечарына з гэтай нагоды ў Менскай філярмоніі, а ў Гарвыканкаме ішло "сваё" паседжаньне, на якім чыноўнікі ніяк не згаджаліся перайменаваць цэнтральны Менскі праспэкт і надаць яму славутае імя. Мы, дэпутаты, прысутнічалі на ім, і ціснулі, ціснулі ўпартых чыноўнікаў. Тут моцна пастараліся дэпутаты А.Завадзкі, А.Гурыновіч, В.Кузьміч, і ўсе дэпутаты камісіі па Культуры. Мы гаварылі, што гэта вялікі сорам не ўшанаваць такое славутае імя, якое ўзьнімае ўсіх нас, беларусаў, у сьвеце, тым больш у юбілейны год. У рэшце рэшт рашэньне было прынята, але зь вялікім боем. Дэпутат Андрэй Завадзкі проста з паседжаньня паехаў у філярмонію, каб паведаміць пра прынятае рашэньне.

Вуліцу Максіма Багдановіча ўдалося адваяваць таксама толькі таму, што гэта быў юбілейны год Паэта, і мы склікалі на паседжаньне ўсіх, каго маглі. Перайменаваць вуліцу расейскага камуністычнага пісьменьніка Горкага (адну з самых доўгіх вуліцаў Менска) камуністы не хацелі, таму вялікая вуліца была падзелена. Імя беларускага генія ўдалося надаць тады, фактычна, толькі палове вуліцы, астатняя частка засталася "горкай".

Тым ня менш і надалей дэпутаты працавалі актыўна, вынесьлі на сэсію і дамагліся прыняцьця вельмі важных рашэньняў, пра якія я казала раней (гэрб Пагоня, Бел-Чырвона-Белы сьцяг і інш.). Але потым пад уплывам неспрыяльных для беларускага Адраджэньня падзеяў сябры гэтай камісіі неяк аслаблі, абвялі, некаторыя здаліся, некаторыя зусім "зышлі ў цень" і да змаганьня за Бацькаўшчыну, за беларускую культуру сталіся няздатнымі. Першым ідэі Адраджэньня здрадзіў дэпутат У.Шаранда. Пачынаў ён як актыўны прыхільнік беларусізацыі, падтрымліваў вяртаньне беларускай мовы ва ўстановы беларускай культуры, але, адчуўшы перавагу Лукашэнкі, рэзка і цынічна перайшоў да ворагаў Адраджэньня Беларусі і ўжо гэтаксама актыўна падтрымліваў антыбеларускі рэжым, выступаў супраць беларускіх школаў і ўжо казаў адваротнае, што беларускія школы не патрэбныя, бо "непэрспэктыўныя" і г.д. (сваіх дзяцей, як я чула, перавёў у рускую школу).

Але вялікія правы і магчымасьці ўсё яшчэ заставаліся ў старшыні Камісіі па культуры Ігара Чарняўскага, і па сваёй ўласнай ініцыятыве ён шмат што мог зрабіць. На жаль, Ігар Чарняўскі да пасьлядоўнага змаганьня аказаўся непадрыхтаваным. Яго неактыўнасьць абурала. Магчымасьці працаваць на карысьць беларускай культуры ў Камісіі па культуры былі немалыя і пасьля выбараў Лукашэнкі ў 1994 годзе, бо рашэньні Гарсавета ў гэтым накірунку ніхто не адмяняў. Але трэба было ставіць прынцыпова і востра пытаньні перад чынавенствам, перад установамі культуры горада. Як старшыня Камісіі Ігар Чарняўскі на гэта не пайшоў, дбаючы, відаць, пра памяркоўныя дачыненьні з існуючым чынавенствам. Ён клапаціўся гэтак пра "заўтрашні дзень". Калі Камісія па культуры зусім падпарадкавалася антыбеларускай ўладзе і фактычна адмовілася дзейнічаць на карысьць Адраджэньня, тады я ў знак пратэсту выйшла са складу гэтай Камісіі і засталася сябрам толькі адной камісіі (па адукацыі).

(Працяг будзе.)

Красавік 1991г. Шматсоттысячны пратэст рабочых Менска супраць дзеяньняў камуністычных уладаў.

## СПАДЧЫНА

### *Вярнуўся Агінскі*

У Беларусь перададзены архіў вядомага дзеяча еўрапейскай гісторыі і культуры Міхала Клеафаса Агінскага. Урачыстая цырымонія прайшла ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі.

У ёй узялі ўдзел пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў, міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў, старшыня Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны, старшыня Камітэта па архівах і справаводстве пры Савеце міністраў Уладзімір Адамушка і іншыя. Паводле інфармацыі Міністэрства замежных спраў, раней архіў кампазітара захоўваўся ў Расійскім дзяржаўным архіве старадаўніх актаў, куды ў 1833 годзе яго перадаў сын М.К.Агінскага. Архіў кампазітара ўключае больш як 5,9 тыс. лістоў.

М.К.Агінскі — кампазітар, музыкант, сенатар, адзін з выбітных дзеячаў еўрапейскай гісторыі і культуры, удзельнік паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. У Беларусі роду Агінскіх належала некалькі маёнткаў. Лічыцца, што менавіта ў вёсцы Залессе (Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці) быў напісаны адзін са славутых твораў М.К.Агінскага — паланэз "Развітанне з Радзімай".

**Наталля ПЫСКО, Таццяна ДАРАШЧОНАК.**

## ЧУЛІ?

### *«Белая русь» месціцца ў доме пісьменнікаў*

У сталічным Доме літаратараў мае юрыдычны адрас рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Белая Русь". Пра гэта стала вядома пасля таго, як старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі атрымаў адказ на свой і Вінцука Вячоркі ліст, дасланы міністру адукацыі і па сумяшчальніцтве кіраўніку "Белай Русі" Аляксандру Радзькову.

Баршчэўскі і Вячорка ў лісце закранулі не толькі пытанні палітыкі і эканомікі, але і адукацыі. У прыватнасці, яны напісалі пра ціск на апазіцыйную моладзь у ВНУ, закрыццё Гуманітарнага ліцэя імя Я.Коласа, адсутнасць беларускамоўнай вышэйшай адукацыі.

Адказ прыйшоў аж праз паўтара месяца і не ад Радзькова, а ад яго намесніка ў "Белай Русі" Пігарава.

Самым важным у гэтай адпісцы быў юрыдычны адрас арганізацыі (раней ён грамадскасці быў невядомы), якая, паводле меркаванняў некаторых экспертаў, можа ў выпадку патрэбы стаць прапрэзідэнцкай партыяй — г.Мінск, вул. Фрунзе, 5-205, РГА "Белая Русь". Нагадаем, што Саюз беларускіх пісьменнікаў быў прымусова выселены з гэтага будынка.

**Алег СНОЎ.**

## ПАЗІЦЫЯ

### *Віктар Крываль патрабуе, каб суддзя вёў працэс на беларускай мове*

Суддзя Мінскага раённага суда Сяргей Афонскі нечакана для сябе трапіў у форс-мажорныя абставіны. 11 лютага ён пачаў суд над адным з лідэраў прадпрымальніцкага руху Беларусі, кіраўніком Мінскай абласной арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Віктарам Крывалем. Але працэс упёрся, як кажуць, у... "моўнае пытанне".

Адміністрацыйная справа на прадпрымальніка з Узды была заведзена яшчэ 10 студзеня. За некалькі гадзін да пачатку акцыі пратэсту індывідуальных прадпрымальнікаў на шашы Мінск—Слуцк брыгада міліцыянтаў спыніла мікрааўтобус, якім ехалі ў Мінск Віктар Крываль, прадпрымальнік з Салігорска Аляксандр Цацура, яго жонка Тамара і дарослы сын Ілля. Іх усіх затрымалі і даставілі ў пастарунак, дзе склалі пратаколы (нібыта за непадпарадкаванне міліцыі). Адпусцілі толькі зацемна, калі мітынг прадпрымальнікаў скончыўся.

Суддзя С.Афонскі, прыступаючы да разгляду справы В.Крываля, відаць, і не здагадваўся, з якой праблемай сутыкнецца праз хвіліну-другую. Мяркуючы па ўсім, ён спяшаўся, бо нават не апрануў судзейскую мантыю. Пікантнасць сітуацыі да свядомасці суддзі дайшла толькі тады, калі на сваё пытанне да Крываля "Число, месяц, год рождения?" ён пачуў: *"У мяне просьба. Я б хацеў адказваць на вашыя пытанні на маёй роднай беларускай мове і хацеў бы, каб вы задавалі пытанні па-беларуску"*.

Суддзя С.Афонскі ад нечаканасці перайшоў на трасянку: *"А вы русскую мову понимаете?"*

Аднак В.Крываль настойваў на сваім: *"Я, магчыма, разумею таксама англійскую мову альбо нямецкую, але прашу весці працэс па-беларуску. Я нічога лішняга не прашу. Карыстаючыся законам і Канстытуцыяй, я патрабую свайго: каб працэс вялі па-беларуску".*

Мяркуючы па далейшых дзеяннях суддзі, для яго ў пэўным сэнсе сапраўды склаліся форс-мажорныя абставіны. Служыцеля беларускай Феміды можна нават зразумець. Лёгка запатрабаваць: суддзя, перайдзі на беларускую мову! А калі гэта мова (хоць і дзяржаўная) амаль не выкарыстоўваецца ў судовай практыцы, калі не хапае адпаведнай моўнай падрыхтоўкі?..

Нейкі час сп.Афонскі спрабаваў весці справу па-расійску, але Віктар Крываль ігнараваў яго пытанні. У рэшце рэшт суддзя зрабіў перапынак. Прыкладна праз дзесяць хвілін ён вярнуўся, апрануў мантыю і абвясціў аб пераносе суда на 27 лютага. У той жа дзень павінны прыбыць у суд сведкі-міліцыянты, якія 11 лютага адсутнічалі, а таксама сям'я Аляксандра Цацуры.

У інтэрв'ю "Народнай волі" Віктар Крываль патлумачыў, што 27 лютага ён дакажа ў судзе сваю невінаватасць, прычым зробіць гэта выключна на беларускай мове. Чаму ён вырашыў дамагацца, каб судовы працэс над ім вёўся на беларускай мове? Таму, што, згодна з Канстытуцыяй і пачуццём нацыянальнай годнасці, родную мову ўжо даўно неабходна адраджаць на ўсіх узроўнях нацыянальнай камунікацыі, так бы мовіць, выводзіць з заняпаду.

Што тычыцца мовы Пушкіна, Дастаеўскага, Талстога, Набокава, то сп.Крываль запэўніў, што нічога супраць яе не мае, любіць яе. Але яшчэ больш любіць беларускую мову і лічыць, што руская мова не можа (не павінна) замяніць яе. *"Родная мова, як і родная маці, у нас адна. Гаспадыня з суседняга двара, якая б ласкавая і прыгожая ні была, як бы ні частавала нас, родную матулю ніколі нам не заменіць. Сваёй пастаноўкай моўнага пытання ў судзе я хачу падаць прыклад іншым апазіцыйным палітыкам, якіх улада пераследуе праз суд па палітычных матывах, каб яны таксама патрабавалі ад суддзяў весці працэс па-беларуску. Калі на тое пайшло, яны, як вартавыя закона, павінны лепш за нас — апазіцыянераў — ведаць родную дзяржаўную мову і бегчы наперадзе агульнанацыянальнай справы яе адраджэння ".*

На думку сп.Крываля, заціранне манкуртызаванай дзяржаўнай бюракратыяй карэннай беларускай мовы шкодзіць аўтарытэту Беларусі ў свеце. Афіцыйнае дзяржаўнае карыстанне роднай мовай — гэта справа нацыянальнай бяспекі, захавання беларускага народа як этна-культурнай і палітычнай адзінкі. Сапраўдным патрыётам Беларусі неабходна прыслухацца да слоў старшыні БСДП (Грамада), былога кандыдата ў прэзідэнты Беларусі Аляксандра Казуліна, які лічыць, што беларуская мова павінна стаць прыкметай элітарнасці.

Такім чынам, Віктар Крываль спрабуе стварыць прэцэдэнт. Ужо даўно ні для каго не сакрэт, што судовае справаводства ў Беларусі, як і дзяржаўнае справаводства ўвогуле, вядзецца ў асноўным толькі па-расійску, хаця беларуская мова з'яўляецца мовай тытульнай нацыі і мовай дзяржаўнай. Фармальна яна мае аднолькавы юрыдычны статус з расійскай мовай, але фактычна яна ў дзяржаве — падчарка. Безумоўна, такое становішча абражае беларускі народ. Як сведчыць практыка, аднымі заклікамі выправіць сітуацыю нельга, свядомым грамадзянам неабходна ў кожным канкрэтным выпадку браць ініцыятыву на сябе, як гэта зрабіў Віктар Крываль. Тым больш што фармальна-юрыдычных і маральных перашкод для гэтага не існуе.

**Вячаслаў ОРГІШ.**

*Во як працуюць беларускія мастакі! Прыкладам, у Нацыянальным мастацкім музеі на персанальных выставах — творы мэтраў пэндзля Леаніда Шчамялёва і Уладзіміра Стэльмашонка. А тым часам у сталічным Палацы мастацтва адна за адной, з разбежкай усяго ў гадзіну, адкрыліся ажно тры цікавейшыя выставы мастакоў, якія жывуць у так званай правінцыі, але сягнулі ў сваёй творчасці еўрапейскага ўзроўню. Гэта — тонкі лірык-акварэліст Ягор МЯЖУЕЎ з Маладзечна, выдатнейшы майстар графікі Яўген ШАТОХІН з Пінска і цэлы гурт з выставай "ЖОДЗІНЦЫ".*

## АСОБА

*Яўген ШАТОХІН:*

# «Я веру, што Беларусь стане краінай, дзе грамадзяне будуць не проста натоўпам»

*У сталічным Палацы мастацтва адкрылася выстава знакамітага беларускага мастака Яўгена Шатохіна. З Яўгенам Сяргеевічам гутарыць Зміцер КІСЕЛЬ.*

Спачатку колькі слоў аб жыццёвым і творчым шляху мастака. Нарадзіўся ён у лютым 1947 года, а народныя прыкметы падказваюць, што "лютаўцы" — людзі, моцныя духоўна, валявыя, свабодалюбныя. У праўдзе гэтых слоў я ўпэўніўся на прыкладзе свайго суразмоўцы.

З пачатку 1990-х Яўген прымае ўдзел у рэспубліканскіх саюзных і замежных выставах. У 1988 годзе заснаваў дзіцячую школу выяўленчага мастацтва ў Пінску. Што тычыцца палітычных прыхільнасцяў Я.Шатохіна, то ён сябра Сойму Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі — БНФ "Адраджэньне", адзін з кіраўнікоў яе Пінскай суполкі. З 1990-га па 1999 г. — дэпутат Пінскага гарадскога Савета, дзе ачольваў камісію па культуры. Стыпендыят майстэрні "Альтэна" у г.Альтэна (Нямеччына).

У 1997 годзе звольнены з пасады дырэктара школы паводле палітычных матываў. Але гэта не перашкаджае мастаку плённа працаваць, атрымліваць ганаровыя еўрапейскія ўзнагароды і званні.

З 2004 года — сябра праўлення Брэсцкай абласной арганізацыі Беларускага саюза мастакоў.

**— Яўген Сяргеевіч, калі ласка, некалькі слоў аб плёне мінулага года.**

— Мне стукнула 60, але гэта быў час не нейкага балявання, а асэнсавання свайго шляху, таго, што зроблена. Год прайшоў у новай працы. Удзельнічаў у шмат якіх выставах у Беларусі і за мяжой. У аб'яўлены ЮНЕСКА "Год Напалеона Орды" працягваў шукаць сябе ў гэтым напрамку, паказаў новыя творы, звязаныя з 200-годдзем слыннага земляка. Удзельнічаў у выставе "Каб рунела душа...", прысвечанай чараўніку роднага слова Рыгору Барадуліну...

**— Ці магчыма сказаць, што на вашым шляху ёсць "да" і "пасля"?**

— Безумоўна, ёсць два знакавыя моманты ў жыцці. Першы — гэта калі я у дзесяць год пачаў маляваць і больш ужо не ўяўляў сябе без гэтага занятку. Другі — калі адчуў сябе беларусам, менавіта *беларускім мастаком.* І адбылося гэта пасля асабістага знаёмства з Зянонам Пазьняком, тады я стаў сябрам Беларускага Народнага Фронту. Гэтыя пераломныя падзеі вельмі паўплывалі на ўсю маю творчасць і развіццё асобы.

**— Вы памятаеце сваіх настаўнікаў? Каго з іх асабліва цэніце?**

— Праз колькі дзён, 18 лютага 2008 года, спаўняецца 100 год з дня нараджэння Яўгена Пятровіча Пулхава. Гэта быў цудоўны педагог, выдатны Настаўнік, сустрэча з якім стала для мяне лёсавызначальнай. І, канечне ж, не толькі для мяне. Ён — прыклад служэння сваёй справе.

**— 20 год таму ў Пінску адкрылася школа мастацтваў. Вы былі яе арганізатарам і першым дырэктарам...**

— У той час гарадскія ўлады Пінска запрасілі мяне, каб я ажыццявіў сваю ідэю. Падтрымалі, будынак далі. Але што было ў тым будынку, нават жахліва ўспамінаць. Усё пабітае, гнілое, дзіравае. Ды, добра пастараўшыся, школу ўсё ж адкрылі. Былі задаволены і дзеці, і бацькі, і настаўнікі. Многія выпускнікі ішлі вучыцца далей у адпаведныя ўстановы, звязалі сваё жыццё з выяўленчым мастацтвам. А потым... потым я стаў для мясцовых улад непажаданай асобай. На жаль, на сённяшні дзень ніхто не бачыць перспектыў той школы, не глядзіць далей аднаго дня, не разумее выхаваўчай сілы мастацтва.

**— Ці не маглі б канкрэтызаваць вашу думку?**

— Напрыклад, узяць знакаміты палац Бутрымовіча. Зараз з яго робяць чарговы палац шлюбу! На стары савецкі лад, калі цэрквы закрывалі. Зараз жа царква не забаронена, адчынена для людзей. Дык што, гістарычнаму будынку няма лепшага прымянення, чым па-канцылярску занатоўваць шлюбы? Улады абяцаюць, што там будзе пакой, дзе змесцяць гісторыю палаца. Магчыма, яны гэта і зробяць, але плошча пад гістарычны пакой — меншая за пакой для нявесты. Тут няма чаго і казаць... Гэта працяг вынішчэння беларускай культуры, беларускай гісторыі.

З гэтым жа палацам звязаны такія славутыя імёны, як Орда, Скірмунт, Радзівіл, Панятоўскія... Без гэтых імён уявіць гісторыю Беларусі немагчыма. Дэкларуючы захаванне спадчыны, развіццё турыстычнай інфраструктуры (бо модна), насамрэч выціскаюць сапраўдную гісторыю.

**— Кажуць, што людзі творчыя нярэдка бываюць дзіўныя, жывуць у сваім, незразумелым іншым, сусвеце. Вы з гэтым згодны?**

— Лічу, што ў кожнага свой духоўны сусвет: у кагосьці — як капейка, а ў іншага — цэлы акіян! У людзей творчых, якія займаюцца самаадукацыяй, ён, безумоўна, шырокі і глыбокі. Наконт "дзіўнасці" мастакоў адкажу, што гэта бальшавіцкая прапаганда, боязь з боку ўлад асоб з моцнай духоўнасцю і, як вынік, іх фізічнае знішчэнне (Курапаты, Трасцянец, Лошыцкі Яр і г.д.). Толькі ўсё роўна яны не забілі мастацтва, бо гэта немагчыма.

**— Падзяліцеся творчымі планамі на бліжэйшы час.**

— Адкрыццё персанальнай выставы ў Палацы мастацтваў — гэта вельмі значная падзея ў маім жыцці. Атрымаў запрашэнне правесці выставу ў Нью-Йорку. Збіраюся паказаць свае творы ў Францыі і іншых краінах Еўропы.

А вясной і летам — яны не за гарамі — заўжды вельмі шмат працы ў мастака.

**— Вядома, у ХІХ—ХХ стагоддзях Беларусь дала свету выдатных непаўторных мастакоў. Гэта Орда, Аляшкевіч, Хруцкі, Драздовіч і іншыя. А з чым выяўленчае мастацтва Беларусі ўвайшло ў ХХІ стагоддзе?**

— Наша выяўленчае мастацтва мае пад сабой моцную глебу — Беларускую нацыянальную ідэю. Гэтая глеба фарміравалася дзесяцігоддзямі, папярэднімі пакаленнямі таленавітых суайчыннікаў. Гісторыя напоўнена выбітнымі імёнамі творцаў, без якіх ужо нельга ўявіць не толькі айчыннае мастацтва. А колькі маладых, таленавітых мастакоў з'явілася ў апошнія часы — арыгінальных, моцных, яркіх! І хоць нярэдка наша нацыянальнае мастацтва зараз дзейнічае амаль у падполлі, але з'яўляюцца новыя і новыя творы, якія, трэба думаць, пераижывуць свой час.

**— Яўген Сяргеевіч, вам хочацца сказаць нешта моладзі, землякам?**

— На парозе 90-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі кажу з усёй упэўненасцю тым, хто здольны прыпасці да родных каранёў, якія нададуць моцы ў змаганні за Незалежнасць Бацькаўшчыны. Я веру, што наша Беларусь будзе вольнай краінай, дзе грамадзяне стануць не проста натоўпам, а сапраўднымі людзьмі з высокай чалавечай годнасцю. Усё залежыць толькі ад нас!



Вясковы флот. З нізкі "Палескія вындроўкі". 1999 г. Аловак, папера.

## ВЫСТАВА

# Жодзінцы «захапілі» Мінск

Выставу "Жодзінцы" прэзентавалі 20 мастакоў і пісьменнікаў —Аляксей Марачкін, Уладзімір Сіўчыкаў, Рыгор Сітніца, Алесь Аркуш, Сяргей Цімохаў, Аляксандр Ксяндзоў, Валеры Славук, Мікола Андруковіч, Уладзімір Гладкевіч, Віктар Зайцаў, Мікола Крайко, Аляксандр Фралянкоў, Мікола Шышлоў і іншыя, чый творчы шлях знітаваны са слаўным горадам па-над Плісою. Літаратурна-мастацкі праект руйнуе пэўныя стэрэатыпы і замацоўвае за Жодзінам статус аднаго са старадаўніх і культурніцкіх цэнтраў краіны.

Мінулай восенню ў Жодзінскай гарадской бібліятэцы ўжо адбылася гэтая выстава, на якой былі прадстаўлены жывапісныя, графічныя і літаратурныя творы мастакоў і пісьменнікаў,.

Каардынатар выставы, пісьменнік і выдавец Уладзімір Сіўчыкаў кажа:

*— Жодзіну зусім не сорак чатыры гады, як лічаць асобныя чыноўнікі, што вядуць адлік ад 1963 года, калі гарадскі пасёлак атрымаў статус горада абласнога падпарадкавання. Насамрэч сёлета гораду споўніцца 365 гадоў. Першая згадка пра яго знойдзена ў "Смалявіцкім Інвентары" за 1643 год. Там ёсць запіс, дзе Жодзіна ўпамінаецца пад назвай Багуслаў Поля: князь Багуслаў Радзівіл загадаў выдзеліць на ускрайку аднаго са сваіх уладанняў — Смалявічаў 400 пляцаў пад новае паселішча... Наш праект руйнуе яшчэ адзін стэрэатып: Жодзіна не толькі індустрыяльны, але і культурніцкі цэнтр краіны. А ідэя выстаў, літаратурна-мастацкіх імпрэзаў і ў іншых гарадах Беларусі — у Полацку, Наваполацку, Лагойску, Горках, Заслаўі, лічу, арганічная і плённая. Да таго ж мы здолелі выдаць і альбом "Жодзінцы. Жывапіс. Графіка. Мастацкае слова".*



Адным з найбольш яркіх экспанатаў стаўся партрэт заснавальніка горада князя Багуслава Радзівіла аўтарства Аляксея Марачкіна.

*— Мы ўсе — спадчыннікі вялікай гісторыі,* — гаворыць знакаміты мастак, *— у нечым авантурнай. Авантурыстам, фігурай яркай, неадназначнай быў і Багуслаў Радзівіл. Ну, уявіце: у Галандыі выклікаў на дуэль кузена прынца і перамог яго; нейкі час правёў у Бастыліі; кантактаваў з усімі тагачаснымі еўрапейскімі манархамі. Усё жыццё адстойваў інтарэсы Вялікага княства Літоўскага. І сёння ў Жодзіне многа неардынарных людзей, адбываецца шмат цікавага, і гэта мы хацелі падкрэсліць выставай.*

Ужо на першай выставе ў Жодзінскай бібліятэцы, якая сталася сапраўдным святам для гараджан, экспанавалі свае творы даравітыя мастакі рознага жыццёвага веку і разнастайных стыляў, у самых разнастайных тэхніках і матэрыялах — ад сюжэтнай гуашы "На аўтазаводзе", пакладзенай калісьці на паперу Ігарам Марачкіным яшчэ ў пяцігадовым узросце, да парадна-рамантычнага алейнага партрэта заснавальніка горада над Плісою.

Віртуальна, як модна цяпер казаць, прысутнічае на экспазіцыях "Жодзінцаў" і абраз "Маці Божая ахвяраў Чарнобыля", напісаны Аляксеем Марачкіным і асвечаны святарамі розных канфесій і месціцца ён сёння ў цэнтры іканастаса Жодзінскай Свята-Архангела-Міхайлаўскай царквы.

Шмат змянілася за апошнія дзесяцігоддзі ў самасвядомасці творцаў, ім адкрыліся новыя гістарычныя і эстэтычныя далягляды. Мабыць, менавіта таму прысвячаюцца літаратурныя імпрэзы і мастацкія выставы 365-годдзю горада, якое, дзякуючы дапытлівасці сталічных і мясцовых гісторыкаў з краязнаўцамі, узаконена і адзначаецца сёлета.

Аляксей Марачкін (Алесь MaRa). "Багуслаў Радзівіл, ваенны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, мецэнат" (2007)

*— Хачу падзякаваць новаму кіраўніцтву Саюза мастакоў, якое прадаставіла нашай выставе найпрэстыжнейшую залу,* — дадае Уладзімір Сіўчыкаў. — *Адзначу яшчэ, што многія з удзельнікаў выставы хацелі б падарыць свае творы Жодзіну, закласці такім чынам падмурак калекцыі карціннай галерыі, якой у горадзе пакуль няма.*

Калі спадзяванні арганізатараў адметнага літаратурна-мастацкага праекта спраўдзяцца, то неўзабаве можна будзе наведаць і будучую Жодзінскую мастацкую галерэю!

Выставу "Жодзінцы" можна паглядзець да 17 лютага з 10.00 да 19.00 у сталічным Палацы мастацтва (вул. Казлова, 3).

**Сяржук УЛАДЗІМІРАЎ.**

Аляксандр Ксяндзоў. "Пярліна-5" (2007).

## ...І ПАЭЗІЯ

**Як і "паложана" сапраўдным дзеячам Адраджэння, некаторыя сучасныя беларускія мастакі-адраджэнцы, працягваючы традыцыю мінулых эпох, выказваюць шматграннасць свайго таленту не толькі ў выяўленчым мастацтве. Скажам, Аляксей Марачкін, Рыгор Сітніца, Алесь Шатэрнік, Уладзімір Сіўчыкаў, Мікола Андруковіч і іншыя не толькі малююць, ствараюць скульптуры, а і пішуць вершы, прозу, публікуюць іх. А галоўнае — і ў творчасці, і ў перакананнях, і ў грамадскіх справах сілкуюцца глыбокім патрыятычным пачуццём, духам Беларускай нацыянальнай ідэі, любасцю да роднай зямлі. Менавіта тэма Радзімы яднае творчасць непаўторных, самабытных майстроў.**

**Прапануем увазе чытачоў лірычную элегію мастака Міколы Андруковіча з альбома "Жодзінцы. Жывапіс. Графіка. Мастацкае слова".**

*Мікола АНДРУКОВІЧ*

### Элегія

*Лагоднае сонца ласкавым святлом*
*Цешыць дрэвы, траву і зямлю.*
*Павуціннe бязважка лунае ў паветры,*
*Ападае на вільготную раллю.*
*Росныя промні гуляюць у хованкі.*
*Годна прырода-мастачка малюе сябе*
*Маляўнічымі фарбамі восені,*
*Нібы ў жадана-чароўным сне.*
*У золата й чырвань адзета,*
*Задуменна глядзіць на мяне,*
*Лістоту кідае бабіна лета,*
*У кожным руху яскрава імкне.*
*Кляновы лісток на сцяжыне свеціцца*
*І пад ветрыкам ціхім трымціць.*
*Млосна Пліса ў нізіне песціцца*
*І ў блакітнае неба глядзіць.*
*Вітаю цябе, дарагая старонка,*
*З дзяцінства ўлюбёны від,*
*Вітаю цябе з элегічным настроем,*
*Бацькоўскі мой краявід!*

ПРАБЛЕМА

# Навошта вялікі сабака ў малой кватэры?

**У мінулым годзе ў Мінску на вуліцы Каліноўскага стафардшырскі тэр'ер напаў на пакінутую без нагляду 5-месячную дзяўчынку. Ад мноства раненняў яна праз некалькі гадзін памерла ў бальніцы. Гісторый, падобных на гэтую, процьма. Але колькі б ні пісалася аб тым, што дазволіць сабе ўтрыманне сабак буйных парод могуць у асноўным толькі жыхары прыватнага сектару, заводзіць іх працягваюць жыхары нават аднапакаёвых кватэр.**

**Навошта?**

**Іван НАВАТВОРЦАЎ, 17 гадоў, навучэнец МГПТК паліграфіі:**

— Я не лічу свайго стафардшырскага тэр'ера буйным сабакам, хутчэй яго памеры можна ахарактарызаваць як сярэднія. Гэта байцовая парода, таму праблемы ў асноўным узнікаюць, пакуль сабака яшчэ малы. Пры ўмове правільнага выхавання атрымліваеш сапраўднага сябра сям'і, а няправільнага — сабаку-забойцу. У мяне з маім асаблівых цяжкасцяў не ўзнікае. Можа, толькі тое, што яго трэба рэгулярна выгульваць, але, мяркую, уласную ляноту можна перамагчы. У рацыён уключаем тое, што ўжываем самі, а сабака ў сваю чаргу не капрызіць і прымае тое, што даюць. Вядома, у яго свой адметны характар, ён часам можа пакрыўдзіцца, але не надоўга. Праўда, на жаль, часам здараюцца і выпадкі агрэсіі, але толькі ў дачыненні да іншых сабак, а не да людзей. Я абсалютна не шкадую аб сваім выбары.

**Святлана ПЯТРОВА, 65 гадоў, пенсіянерка:**

— Я жыву адна, мужа не стала два гады таму, а ў сына ўжо свая сям'я, шмат клопатаў, і ў госці да маці наведацца ён можа не заўсёды. Мой сабака — нямецкая аўчарка, але не чыстакроўная, сумесь з дварняком. Адкуль у пенсіянера грошы на шчанюка ад дыпламаваных бацькоў? Купіла яго па аб'яве ў газеце. Можна сказаць, жыццё набыло новы сэнс: як быццам нарадзілася дзіця, актыўнае, неразумнае, але вельмі ласкавае і пяшчотнае. Цяпер мне ёсць з кім гуляць альбо сумаваць у доўгія зімовыя вечары. Безумоўна, часам даводзілася і за дубец хапацца, збіраць па ўсёй хаце схаваныя косткі ды прыбіраць розныя непрыемныя прадукты жыццядзейнасці. Але ўсё гэта мы перажылі, пасталелі. Зараз з задавальненнем глядзім тэлевізар і не спрабуем брахаць на яго ды на ўласны адбітак у люстэрку. Ведае мой сабака цяпер і сваё месца, але ўсё ж, калі вельмі холадна, просіцца да мяне пад коўдру, і я яму не адмаўляю.

**Яўген ІВАНОЎ, 40 гадоў, прадпрымальнік:**

— А ў мяне былі праблемы з залішняй вагой, і я вырашыў завесці вялікага сабаку (смяецца). Не, на самай справе мне, як чалавеку немаленькаму, і сабакі падабаюцца адпаведныя. Я магу дазволіць сабе гэта, і, вядома, праблем з харчаваннем у сабакі не ўзнікне, праўда, апетыт майго мяне працягвае ўражваць! А ўвогуле, мой ратвейлер такі ж добры і памяркоўны, як я: любіць дзяцей і ўтульнае крэсла. Толькі вось чамусьці аўтарытэтам у сям'і абраў не мяне, такога да яго падобнага, а маю мініяцюрную жонку. Усюды за ёю бяжыць: і ў краму, і смецце выносіць — сапраўдны джэнтльмен.

**Аляксандра ШВЯЦОВА, 20 гадоў, прадавец:**

— У мяне быў баксёрдзяўчынка. Абставіны склаліся так, што прыйшлося, на жаль, аддаць яе назад заводчыкам, у якіх я ўзяла сабаку ў арэнду. Праблемы ўзніклі адразу, але напачатку гэта можна было цярпець, прымаючы пад увагу малы ўзрост сабакі і яе неадаптаванасць да новага жытла. Спачатку давялося, часам нават сілавымі метадамі, адвучыць сабаку рычаць і брахаць на мяне, сваю гаспадыню. Гэты этап быў паспяхова пройдзены, і я працягвала клапаціцца пра сваю "дачку", нягледзячы на некалькі знішчаных пар абутку і скінуты на падлогу тэлевізар. Сама часам недаядала, каб сабака добра харчаваўся, купляла разнастайныя вітаміны, штовечар вадзіла на выгул, дзе збіраюцца сабакаводы-аматары. Здавалася, што ўсё нарэшце будзе добра: былі засвоены адпаведныя каманды, прыняты ўдзел у некалькіх выставах з атрыманнем прызавых і нават першага месцаў. Адзінай нязначнай праблемай засталіся суседскія каты, убачыўшы ці пачуўшы нюхам якіх, мой сабака ўключаў "поўны наперад", а я ляцела за ім, як вэлюм за нявестай. Думаю, усё было б добра, але я ўладкавалася на новую працу і стала вяртацца дахаты значна пазней, прычым пра сабаку я не забылася, і кожны дзень пакідала сваёй сяброўцы ключы ад кватэры, каб яна пакарміла і выгуляла яго. Але мой сабака проста пакрыўдзіўся на мяне, і ператварыў маю аднапакаёўку ў немаведама што.

Рабіць свае "сабачыя справы" на вуліцы ён катэгарычна адмовіўся. Рэчы, ад цацак да пральнага парашку, бязлітасна знішчаліся. А паколькі прапанаваную працу мне не хацелася страціць, давялося са слязьмі на вачах з сабакам развітацца.

**Ілля ОРСІК, 19 гадоў, беспрацоўны:**

— Я заўсёды хацеў вялікага сабаку. Для мяне і прывабнасць майго Джэка ў асноўным у тым, што ён вялікі. Ён нармальна адчувае сябе ў кватэры пры ўмове рэгулярнага наведвання вуліцы. Толькі часам, калі яму сумна, пачынае брахаць і выць, на што скардзяцца суседзі. А так ніякіх складанасцяў з ім няма, мне няцяжка за ім прыбраць альбо памыць яму лапы. Затое ён мой сапраўдны сябар, і заўсёды, калі я куды-небудзь іду ў цёмны час сутак, стараюся ўзяць яго з сабою, бо ўпэўнены, што ў наш неспакойны час вялікі сабака можа стаць надзейным гарантам маёй бяспекі.

**Ірына МУРАЎЁВА.**

ЧУЛІ?

## *«Новы час» не здаецца...*

**Калегія суддзяў Мінскага гарадскога суда пакінула без змен рашэнне суда Першамайскага раёна сталіцы ў дачыненні да газеты "Новы час" і журналіста Аляксандра Тамковіча.**

Нагадаем, што, згодна з рашэннем, рэдакцыя газеты павінна сплаціць Мікалаю Чаргінцу 50 мільёнаў рублёў, а Аляксандр Тамковіч -- 1 мільён рублёў.

Падставай для судовага разбіральніцтва стаў артыкул Аляксандра Тамковіча, надрукаваны ў газеце "Новы час". Артыкул пад назвай "Генерал-сенатар Мікалай Чаргінец" выклікаў абурэнне ў яго галоўнага героя. Нягледзячы на прапанову рэдакцыі надрукаваць у парадку палемікі свой погляд на спрэчныя моманты артыкула, Чаргінец вырашыў адразу звярнуцца ў суд.

На пасяджэнні ў Мінскім гарадскім судзе прадстаўнікі істца не прысутнічалі. У сваю чаргу прадстаўнік адказчыка -- рэдактар "Новага часу" Аляксей Кароль яшчэ раз паведаміў, што іск не прызнае і з рашэннем суда першай інстанцыі не згодны. Аднак калегія суддзяў Мінскага гарадскога суда пад старшынствам суддзі Басава падстаў для адмены рашэння не знайшла.

Пасля агалошвання рашэння Мінгарсуда Аляксей Кароль адзначыў: "Ёсць такая прымаўка: спадзяемся на лепшае, але рыхтуемся да горшага. У нашым выпадку адбылося другое. Рашэнне, у прынцыпе, чакаемае. Праўда, было спадзяванне, што нейкае паслабленне магло б быць. Безумоўна, гэты прысуд ставіць пад пагрозу далейшы выхад газеты. У сувязі з гэтым мы ўжо напісалі зварот да чытачоў, з тым каб сумеснымі намаганнямі сабраць неабходную суму. Мы вельмі спадзяёмся на іх падтрымку.

Да таго ж мы шчыра верым у тое, што генерал Чаргінец стрымае сваё слова і накіруе грошы, атрыманыя ў якасці маральнай кампенсацыі, ва ўстановы, дзе ўтрымліваюцца нервова-хворыя людзі. Такім чынам, мы разам з чытачамі здзейснім дабрачынную акцыю -- дапаможам людзям, якім патрэбна дапамога".

Аляксей Кароль адзначыў, што рашэнне Мінскага гарадскога суда таксама будзе абскарджана.

Тым часам палітык і былы адвакат Ігар Рынкевіч выступіў з заклікам да незалежных журналістаў байкатаваць Мікалая Чаргінца як публічную асобу.

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

## *Жывыя сведкі трох стагоддзяў*

Тытул найстарэйшых жыхарак Беларусі афіцыйна носяць Ганна Паўлаўна Рагель (дата нараджэння — 4 ліпеня 1889 года) і Марыя Міхайлаўна Мельнік (нарадзілася 1 ліпеня 1890 года). Першая зараз жыве ў горадзе Маладзечне, а другая — у вёсцы Паляшыцы Горацкага раёна Магілёўскай вобласці.

Як паведаміла прадстаўніца Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Святлана Ермаковіч, на 1 студзеня гэтага года 100-гадовую мяжу ў Беларусі пераадолелі 643 чалавекі. Больш за ўсё доўгажыхароў на Міншчыне. Увогуле па краіне больш за сто гадоў маюць 561 жанчына і толькі 82 мужчыны.

Свой 110-гадовы юбілей ужо адзначылі 16 нашых землякоў.

## *Скрывался в землянке*

**32-летний мужчина, сбежавший из исправительного учреждения открытого типа №17 Гомеля, где отбывал наказание за кражу, три месяца скрывался в землянке, которую оборудовал в центральной части города.**

Как сообщает пресс-служба УВД Гомельского облисполкома, сотрудникам правоохранительных органов удалось задержать беглеца, когда тот находился в своем жилище. Предполагая, что его будут искать дома, после побега он решил не возвращаться к родственникам, а предпочел оборудовать себе жилище в заброшенном техническом помещении на земляном склоне у Сожа за Городской больницей скорой медицинской помощи. От опоры электропередач, расположенной неподалеку, он провел себе электричество, благодаря чему имел свет и тепло, а также смастерил сигнализацию, предупреждавшую о приходе незваных гостей. Жил за счет средств, заработанных на стройке.

Получив информацию о предполагаемом месте нахождения осужденного, сотрудники исправительного учреждения проверили склон и обнаружили тщательно замаскированную землянку. Мужчина был арестован и направлен в СИЗО. В настоящее время он препровожден в спецкомендатуру.

**Паслугі**

**Прыём макулатуры, шклатары і інш. Дапамога інвалідам, пенсіянерам г.Мінска. Тэл.261-11-87, 8-033-661-11-87, 8-044-761-11-87, 8-025-961-11-87.**

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ЧТО...

## Белорусы в Книге рекордов Гиннесса

**Впервые Книга рекордов Гиннесса была опубликована в 1955 году и названа в честь ирландской пивоваренной компании "Гиннесс".**

Именно управляющему "Гиннесса", сэру Хью Биверу, пришла в голову мысль опубликовать такую книгу для завсегдатаев пабов с их вечными спорами по поиску ответов на вопросы викторин.

К настоящему времени Книга Гиннесса издается более чем в 100 странах мира и переведена более чем на 23 языка. Книга стала самым многотиражным изданием из защищенных авторским правом. По тиражам ее обошли только Коран и Библия.

Художник Александр Кищенко попал в Книгу рекордов Гиннесса в 1989 году за "Гобелен века", вытканный вручную на Борисовском комбинате прикладного искусства. Полотно имеет размеры 14 на 19 метров. Площадь гобелена — 266 кв. м, вес — 286 килограммов. На нем воспроизведены события XX века и изображено более 80 известных политиков и деятелей культуры.

Мастер международного класса по кикбоксингу, четырехкратный чемпион СССР и стран СНГ, а еще и певец Альберт Скороход оказался в книге за исполнение песни "Перевернутый мир" в стойке на голове.

Конькобежец Игорь Железовский шесть раз становился абсолютным чемпионом мира по спринтерскому многоборью. Правда, у него нет ни одного олимпийского "золота".

Гимнаст Виталий Щербо завоевал сразу шесть золотых медалей на одной Олимпиаде (1992 год, Барселона).

Множество рекордов в подъеме тяжестей различными способами за разные промежутки времени у силача Вячеслава Хоронеко. Вот некоторые результаты:

— за 48 часов поднял кег с питьевой водой весом 40 кг 6160 раз. Рекорд установлен 4 марта 2005 года;

— за 36 часов поднял бочку с пивом весом 40 кг снизу вверх на прямые руки 4221 раз. Рекорд установлен 1 января 2001 г. в г. Минске;

— под водой, сидя в шпагате, за 52 секунды поднял гирю 32 кг одной рукой 21 раз;

— за 1 минуту поднял штангу весом 150 кг способом "становая тяга" (наклоны) 45 раз;

— за 10 минут, сидя в шпагате, одной рукой выжал гирю весом 32 кг 100 раз;

— за 6 часов поднял бочку с пивом весом 62,5 кг снизу вверх на прямые руки 925 раз.

Сразу несколько рекордов балансирования вписал в знаменитую книгу могилевчанин Александр Бендиков. Свой первый рекорд Бендиков установил еще в 1994 году, поставив на ребро 522 костяшки домино. В 1995 году он осуществил еще одну свою задумку: на ребре монеты разместил 880 монет. Спустя два года на пивзаводе "Крыніца" он снова ставит рекорд, построив пирамиду из 410.040 пивных крышечек. Свое последнее достижение Бендиков представил в 2003 году. На сей раз это были 257 выложенных столбиком на ребре монеты монет.

В Книгу рекордов Гиннесса был занесен тяжелоатлет Леонид Тараненко с мировыми рекордами в толчке — 266 кг и 475 кг в сумме (1988 год, Канберра, Кубок супертяжеловесов).

Белоруска Алеся Гулевич попала в Книгу за то, что 26 апреля 2004 года в цирке "Биг Эпл" бостонского выставочного центра (США) сумела одновременно удержать 99 хулахупов (по другим сведениям — 101). И не просто удержать, а, согласно правилам, трижды прокрутить их. Рекордсменка — потомственная артистка. Ее отец Федор Гулевич — клоун, мать Надежда Гулевич — воздушная гимнастка. Правда, некоторое время назад семья уехала в Америку. Но в Книге рекордов Гиннесса Алеся проходит под белорусским флагом.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

# У любы дзень

*любы чалавек можа зрабіць перадаплату за будучыя нумары "Народнай волі"*

Сёння мы зноў звяртаемся да тых, каму, магчыма, ўпершыню трапіла ў рукі "Народная воля". Хочаце стаць пастаянным чытачом? Калі ласка, зрабіце **перадаплату** за будучыя нумары.

Ёсць магчымасць зрабіць **перадаплату** за месяц, два, тры — калі ласка! Можна аплаціць і ўсе нумары першай паловы 2008 года.

У чарговы раз нагадваем: для таго каб зрабіць **перадаплату**, Вам трэба завітаць у любы філіял "Беларусбанка" альбо ў любое паштовае аддзяленне і запоўніць бланк, узор якога мы друкуем кожны тыдзень. Мінчане могуць апературыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: **328-63-93** ці **328-68-71**. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна зрабіць перадаплату за ўсё паўгоддзе альбо за пэўны перыяд: месяц, два, тры...

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

**УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.**

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

**Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!**

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть) | | | | |
| Плательщик | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть) | | | | |
| Плательщик | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

**КВИТАНЦИЯ**

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

## Абонентская карточка

*на номера газеты «Народная воля»*
**за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.**
*(ненужное зачеркнуть)*

*Заполняется печатными буквами и обязательно отправляется в редакцию с копией платежного документа*

фамилия
имя отч.
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
*город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)*
улица
пр-т
переулок *(нужное— подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* корп. кв.

*(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)*

SOS!

## *У Мінску расце колькасць жанчын-алкаголікаў*

У 2007 годзе ў сталіцы на 10 працэнтаў павялічылася колькасць жанчын, якія злоўжываюць спіртнымі напоямі. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі паведаміла намеснік галоўнага ўрача Мінскага гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера Ірына Кананові. Паводле яе слоў, пад назіраннем сталічнай наркалагічнай службы знаходзіцца каля 45 тыс. пацыентаў, у тым ліку каля 5 тыс. жанчын. Паводле слоў І.Кананові, агульны аб'ём ужывання алкаголю ў Беларусі склаў у 2007 годзе 10,6 літра чыстага спірту ў год на душу насельніцтва, у той час як, паводле даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, гэты паказчык не павінен перавышаць 5 літраў.

**Таццяна ДАРАШЧОНАК.**

**Адрас рэдакцыі:**
**220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.**
**Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.**
**Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906**
**E-mail : nv@promedia.by**
**http://www.nv-online.info**

**Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ**

**У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 12.02.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №**